Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

14 ЛІСТАПАДА 2014 г. ПЯТНІЦА № 216 (27826) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**




**Турыстычны патэнцыял Брэсцкай крэпасці**

СТАР. 3

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Прэм'ер-міністр Міхаіл МЯСНІКОВІЧ:**

***«На ўнутраным рынку прысутнічае яшчэ даволі шмат імпартных харчовых тавараў, аналагі якіх вырабляюць нашы прадпрыемствы. Асартымент айчынных вытворцаў прыкметна пашыраецца і паляпшаецца якасць прадукцыі. Таму ёсць усе падставы сцвярджаць, што імпартны складнік будзе змяншацца не ў шкоду якасці. Вядома, чалавек галасуе сваім кашальком, таму яму павінна быць прадастаўлена магчымасць выбару. Тыя ж макароны, напрыклад, павінны быць і беларускія, і італьянскія. Гэта прымушае нацыянальных таваравытворцаў рабіць больш якасную прадукцыю і працаваць з цаной».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.11.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10750,00 | ■ |
| Еўра | 13380,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 233,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 693,10 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

14216

# А заўтра будуць у снягах аблокі...

***Прынамсі, так абяцаюць і сіноптыкі, і лічбы на календары. Апошнія адносна цёплыя дні гэтай скупой на дождж восені, калі ў вёсцы можна яшчэ вывесці на некалькі гадзін жывёлу папасвіцца па жорсткай стомленай траве, а ў горадзе — прагуляцца па старым парку, задумліва пастаяць над шэрай вадой. І вярнуцца ў цёплы дом, дзе ўтульна, дзе родныя вочы і дзе ні цемра, ні холад, ні мокры снег ніякай улады над чалавекам не маюць.***



Фота Васіля ЗЯНЬКО.

## ПраМова (кіно)

XXI Мінскі міжнародны кінафестываль ЛІСТАПАД 2014

### Нештогадовае пасланне Жан-Люка Гадара. І іншыя

**Тыдзень з кіно на фестывалі — гэта тыдзень з думкамі, развагамі, сюжэтамі і героямі, пошукамі сэнсу і сэнсамі. Гэта тыдзень, праведзены ў асаблівай сістэме знакаў і вобразаў, праз якія з намі хочуць паразмаўляць іншыя людзі. Нешта сказаць. Папярэдзіць. Крычаць пра тое, што баліць. Хварэць за тое, што робіць чалавека чалавекам у самых розных абставінах. І зноў звяртацца да яго з думкай пра тое, як не згубіць сябе. Як разумець сябе і іншых. Як разумець свет, часткай якога з'яўляешся і можаш падтрымліваць гармонію ў ім, ці, наадварот, забіваць яе сваімі дзеяннямі. Мы будзем пра гэта развагаць, калі сёння пачуем назвы лепшых фільмаў, за якія журы і публіка прысудзіць свае ўзнагароды.**

Але пра гэта хочацца разважаць кожны раз, калі адчуваеш кіно як мастацтва і разумееш: яно жывое, таму што не стамляецца здзіўляць, радаваць, выклікаць эмоцыі (і слёзы). І яно як мастацтва па-свойму даследуе рэчаіснасць, гуляе з ёю. Ці перамагае яе. Перамагае, калі мадэлюе ўласную рэчаіснасць, і ты перастаеш адчуваць сябе проста гледачом у крэсле, таму што ўключаешся ў тое, што бачыш.

СТАР. 15

■ Надвор'е

## УЖО І ЎДЗЕНЬ ЧАКАЕМ МОКРЫ СНЕГ...

**У пятніцу тэрыторыя нашай краіны будзе на ўскраіне скандынаўскага антыцыклону, таму ў асобных раёнах пройдуць невялікія дажджы, а месцамі магчымы слабы галалёд, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе 2-8 цяпла. А вось у выхадныя да нас завітае больш халоднае паветра з боку еўрапейскай тэрыторыі Расіі. Месцамі прагназуюцца невялікія ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. У асобных раёнах — туман і слабы галалёд. Тэмпература паветра ў ноч на суботу ад мінус 2 да плюс 4 градусаў, на ўсходзе краіны замаразкі да мінус 5. Удзень чакаецца ад мінус 1 да плюс 5 градусаў, па паўднёвым захадзе Брэсцкай вобласці — да 7 цяпла. У ноч на нядзелю тэмпература знізіцца да мінус 4 — плюс 3 градусаў, на ўсходзе Беларусі — да 7 марозу. Удзень чакаецца ад мінус 2 градусаў па паўночным усходзе да плюс 5 градусаў па паўднёвым захадзе краіны.



Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пачатку наступнага тыдня на тэрыторыі Беларусі ўсталюецца ўвогуле некамфортнае надвор'е. У панядзелак дождж і мокры снег істотна сапсуе настрой жыхарам паўднёва-заходніх раёнаў нашай краіны. У асобных раёнах магчымы туман і галалёд. Тэмпература паветра ў ноч на панядзелак ад мінус 7 да плюс 4 градусаў, удзень — ад мінус 1 да плюс 6.

**Сяргей КУРКАЧ**

# ВЫЗВАЛЯЕШ ПАСАДУ — ВЫЗВАЛЯЕШ КВАТЭРУ

## Любыя спробы прыватызаваць службовае жыллё або застацца жыць у ім пасля завяршэння выканання службовых абавязкаў недапушчальныя

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на нарадзе аб прапановах па парадку прадастаўлення жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання асобным катэгорыям дзяржаўных служачых, паведамляе БЕЛТА.**

«Прашу ўлічваць, што такое жыллё з'яўляецца арэндным, і любыя спробы яго прыватызаваць або застацца там жыць пасля завяршэння выканання службовых абавязкаў недапушчальныя! — сказаў Прэзідэнт. — Яшчэ раз падкрэсліваю: усё павінна быць сумленна і справядліва».

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў ліпені была праведзена спецыяльная нарада, на якой разглядаліся пытанні будаўніцтва і прадастаўлення арэнднага жылля розным катэгорыям грамадзян.

«Асобнай тэмай было выдзяленне спецыяльнага службовага жылля тым дзяржаўным служачым, якім яно прызначаецца. Тады вызначыліся, што, па-першае, такое спецыяльнае жыллё прадастаўляецца кіраўнікам высокага ўзроўню і прадстаўнікам сілавых структур, менавіта тым, каму па характары работы і для выканання патрабаванняў бяспекі сапраўды патрэбна такое жыллё. Прычым толькі на перыяд выканання імі службовых абавязкаў. Умовы адназначныя: працуеш на адпаведнай пасадзе — атрымліваеш жыллё, вызваляеш пасаду — вызваляеш жыллё. Гэта было маё патрабаванне», — сказаў Прэзідэнт.

«Па-другое, мы дамовіліся, што за ўсё трэба плаціць. Гэтае жыллё ўваходзіць у катэгорыю арэнднага, таму той, хто яго займае, плаціць і за арэнду, і за камунальныя паслугі. Як і ўсе нашы грамадзяне», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Акрамя таго, на нарадзе было дадзена даручэнне нанава сфарміраваць пералік пасад дзяржслужачых, якім прызначаецца спецыяльнае жыллё. «Задача ў тым, каб ні ў якім выпадку яго не пашыраць», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы цікавіўся сітуацыяй з даўгабудамі, асобнымі пытаннямі работы жыллёва-камунальнай галіны, а таксама нагадаў аб выканальніцкай дысцыпліне.

Па выніках нарады Аляксандр Лукашэнка даручыў прыняць неабходныя меры па ўнясенні праекта ўказа на разгляд кіраўніка дзяржавы з улікам праведзенага абмеркавання.

# АНАЛІЗУЮЧЫ СІТУАЦЫЮ

## Прэзідэнт лічыць недастатковай работу ў краіне па барацьбе з карупцыяй

**Аб гэтым Аляксандр Лукашэнка заявіў, прымаючы з дакладам старшыню Камітэта дзяржаўнай бяспекі Беларусі Валерыя Вакульчыка, паведамляе БЕЛТА.**

Прэзідэнт звярнуў увагу на работу Камітэта дзяржбяспекі па папярэджанні правапарушэнняў, і перш за ўсё карупцыйных.

«Так, ёсць некаторыя матэрыялы, вельмі сур'ёзныя. Па многіх вашых матэрыялах мы спынілі дзейнасць асобных спрытнюг як у сферы бізнесу, так і ў дзяржаўных органах улады. Але, аналізуючы працэс, лічу, што гэта работа недастатковая», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што яго хвалюе недастатковасць работы пракуратуры ў гэтым накірунку. «Але ў вас ёсць спецыяльныя метады, усё роўна пракуратура без вас не абыдзецца, нават дзейнічаючы па сваіх кірунках», — адзначыў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы арыентаваў тэрытарыяльныя органы КДБ на аналіз сацыяльна-палітычнай, эканамічнай сітуацыі ў рэгіёнах, прадастаўляючы комплексную інфармацыю.

«Я хачу ведаць вашу пазіцыю, ваш пункт гледжання. Ён павінен быць непрадузятым і абсалютна аб'ектыўным, тым больш што вы глыбей можаце паглядзець на нейкія прычынна-выніковыя сувязі», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка таксама папрасіў прадставіць інфармацыю аб сітуацыі ў Гродзенскай вобласці. «Мяне яна не проста насцярожвае, а я памятаю, што было раней. Там жа быў адзіны выпадак у краіне, калі застрэлілі губернатара. І зразумела, якія гэта былі праявы. Ды і ведаю, што памкненні на Гродзенскую вобласць у асобных дзяржаў празмерныя», — адзначыў Прэзідэнт.

# ПРАВА НА ПРЫВАТЫЗАЦЫЮ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ №524 «Аб прыватызацыі жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду».**

Дакумент распрацаваны ў мэтах ліквідацыі прычын, якія перашкаджаюць грамадзянам рэалізаваць права на прыватызацыю жылых памяшканняў, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

У сувязі з адсутнасцю тэхнічных пашпартоў і дзяржаўнай рэгістрацыі на шэраг жылых памяшканняў, якія знаходзяцца ў камунальнай або рэспубліканскай уласнасці (па краіне такіх памяшканняў каля 114 тыс.), вышэйзгаданы дакумент змяшчае нормы, якія прадугледжваюць прадастаўленне арганізацыям, у гаспадарчым падпарадкаванні або аператыўным кіраванні якіх знаходзяцца названыя жылыя памяшканні, правы на прыняцце рашэнняў аб прыватызацыі жылых памяшканняў, што знаходзяцца ў аднакватэрных, блакіраваных і шматкватэрных жылых дамах, без наяўнасці дакументаў, якія сведчаць аб дзяржаўнай рэгістрацыі іх стварэння і ўзнікнення права дзяржаўнай уласнасці на іх, і тэхнічных пашпартоў на гэтыя жылыя памяшканні.

Ва ўказе вызначаюцца магчымасць і парадак карэкціроўкі ацэначнага кошту жылых памяшканняў, разлічанага для мэты іх прыватызацыі, у выпадках, калі патрабуецца прыняцце мер па аптымізацыі неабгрунтавана высокага кошту гэтых памяшканняў (нежылыя будынкі пераабсталяваны ў жылыя, дамы пабудаваны з выкарыстаннем дарагіх эксперыментальных тэхналогій і гэтак далей) . У гэтым выпадку арганізацыям, у гаспадарчым падпарадкаванні або аператыўным кіраванні якіх знаходзяцца такія жылыя памяшканні, прадастаўляецца права на правядзенне незалежнай ацэнкі рынкавага кошту прыватызаванага жылога памяшкання, пасля чаго рашэнне аб прыватызацыі жылога памяшкання прымаецца па меншым кошце.

Указ таксама прадугледжвае, што грашовыя сродкі, унесеныя работнікамі дзяржаўных арганізацый у лік аплаты кошту будаўніцтва жылых памяшканняў, пабудаваных дзяржаўнымі арганізацыямі з частковым прыцягненнем сродкаў сваіх работнікаў, залічваюцца ў аплату кошту жылых памяшканняў пры іх прыватызацыі прапарцыянальна часткі плошчы жылых памяшканняў, якая была пабудавана за кошт прыцягнутых грашовых сродкаў гэтых работнікаў, пры наяўнасці заключаных дагавораў аб сумесным будаўніцтве жылых памяшканняў і (або) дакументаў, якія пацвярджаюць суму ўнесеных гэтымі работнікамі грашовых сродкаў.

■ Блізкая ўлада

# ЧАМУ НЕ КУПЛЯЮЦЬ МАЛАКО Ў ГАСПАДЫНІ?

## Пытанні, якія адрасуюць старшыні аблвыканкама, нярэдка можна вырашыць у сельсавеце або райвыканкаме

**На «прамую лінію», якую праводзіў старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін СУМАР, дазванілася 26 жыхароў вобласці. Пасля яе заканчэння губернатар падкрэсліў, што абсалютная большасць зваротаў датычыліся набалелага. Людзі звярталіся з просьбамі наконт будаўніцтва і прыватызацыі жылля, рамонту пад'ездаў дамоў і дарог, добраўпарадкавання тэрыторый. Сельскія жыхары прасілі павялічыць колькасць ліхтароў на вуліцах, гарадскія — падоўжыць маршрут гарадскога аўтобуса да паліклінікі. Усе звароты, як паведаміў кіраўнік вобласці, будуць разгледжаны, па кожным прымуць адпаведнае рашэнне.**



Адной з першых дыялог з губернатарам вяла Любоў Роля з вёскі Велясніца Пінскага раёна. Любоў Ціханаўна скардзілася на тое, што ў яе не бяруць малако. Высветлілася, што жанчына мае ў гаспадарцы 10 дойных кароў. Муж яе — інвалід першай групы, таму прыватная гаспадарка стала асноўнай крыніцай дабрабыту сям'і. Вясковая гаспадыня расказала, што буйной рагатай жывёлы ў яе было значна больш і яна планавала адкрыць фермерскую гаспадарку, але не ўдалося вырашыць пытанне з памяшканнем для жывёлы і большую частку статка яна здала. Засталося 10 кароў. Летам рагулі даюць шмат малака, а вось дзяваць яго няма куды, бо нарыхтоўшчыкі да яе не даязджаюць. У сельсавеце, куды жанчына звярталася, ёй прапанавалі самастойна дастаўляць сыравіну на малочны завод у райцэнтр. «Частку малака купляюць дачнікі ў сезон, а астатняе, бывалі дні, хоць ты ў равок вылівай», — скардзілася Любоў Ціханаўна. Ды і цяпер два 40-літровыя бідоны малака Любоў Роля гатова прадаваць.

Канстанцін Сумар тут жа звязаўся па тэлефоне са старшынёй Пінскага райвыканкама Валерыем Рабкаўцом і даручыў вырашыць пытанне з закупам малака ў пэўнай сялянскай гаспадарцы.

З пінскага рэгіёна на гэты раз было дастаткова зваротаў. Жыхарка аднаго з дамоў пасёлка Лагішын прасіла паспрыяць капітальнаму рамонту іх дома, які пачаўся, а потым па незразумелых прычынах спыніўся. З падобнай просьбай звярнуліся і жыхары дома былога ваеннага гарадка з Бярозы. У іх наогул сітуацыя асаблівая. Згодна з дакументамі, дом адрамантавалі ў 1994 годзе, а на справе рамонту не было. Цяпер жыльцы ходзяць па інстанцыях і спрабуюць даказаць, што напісанае не адпавядае рэчаіснасці.

Няпростае становішча склалася і вакол аварыйнага дома ў Давыд-Гарадку Столінскага раёна. Сваю гісторыю расказаў яго жыхар Мікалай Ярмушын. Ва ўсіх выпадках кіраўнікі падраздзяленняў жыллёва-камунальнай службы атрымалі даручэнне выехаць на месца і разабрацца.

Шмат пытанняў па-ранейшаму ўзнікае ў сельскіх жыхароў з прыватызацыяй жылля. Так, Людміла Радчук з вёскі Новая Крыніца Пружанскага раёна не можа прыватызаваць былы калгасны дом, бо калгас даўно перастаў існаваць. Землі далучылі да прадпрыемства «Райсельгасхімія», а жыллё перайшло на баланс райвыканкама. Людзі даведаліся, што прыватызацыя камунальнага жылля ім абыдзецца нашмат даражэй, чым прыватызацыя дома, калі б ён быў на балансе сельгаспрадпрыемства. І, вядома, прасілі, калі магчыма, вярнуць жыллё на баланс райсельгасхіміі.

Яшчэ больш складанай выглядае гісторыя з кватэрай, прыватызаваць якую хоча для свайго пляменніка Валянціна Зубік з Ляхавіцкага раёна. І кватэры пустуюць у вёсцы, і даць людзям іх рады, а вось змяніць статус жылля, якое на балансе райаграсэрвіса, аказалася не вельмі проста. А такая перамена патрэбна для прыватызацыі. Заяўніцам паабяцалі дапамогу, перш за ўсё юрыдычную, бо ў такіх пытаннях трэба прытрымлівацца літары закона.

Маладая маці з брэсцкага мікрараёна Валынка расказала кіраўніку вобласці, як цяжка дабірацца з малымі ў новую паліклініку, якую адкрылі па вуліцы Кіжаватава. Маці з каляскамі вымушаны пераходзіць мост з крутым пад'ёмам і рэзкім спускам. У галалёдзіцу зрабіць гэта практычна немагчыма. Таму для жанчыны адзінае выйсце з гэтай сітуацыі — падоўжыць некалькі маршрутаў гарадскіх аўтобусаў, каб да самай паліклінікі можна было даехаць прама з указанага мікрараёна. Гэта пытанне ўзяў на заметку старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр Рагачук, які прысутнічаў на «прамой лініі».

**Начальнік аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб аблвыканкама Вольга ВАРАБЕЙ** сказала карэспандэнту «Звязды», што гэтая «прамая лінія» яе парадавала:

— Абсалютная большасць заяўнікаў звярталася з канкрэтнымі просьбамі. Многія агучвалі праблемы, якія датычаць цэлай вёскі, вуліцы, пад'езда. Такіх дробязных пытанняў, якія траплялся раней (напрыклад, дзірку ў плоце замазаць альбо памяняць лямпачку ў пад'ездзе ці на слупе), на гэты раз не было. Апошняе сведчыць аб павышэнні ўзроўню культуры зваротаў нашых грамадзян. Многія з тых, хто дазваніўся, гаварылі, што яны звярталіся ў сельскі Савет, райвыканкам і толькі потым прынялі рашэнне званіць на «прамую лінію» да кіраўніка вобласці. Але па-ранейшаму застаюцца і тыя, хто, мінуючы мясцовую ўладу, спрабуе вырашыць свае праблемы «наверсе».

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■

■ Факты

## «ВЯСЁЛКА» Ў СМАЛЯВІЧАХ

**У Смалявічах расчынілі дзверы новыя дзіцячыя яслі-сад «Вясёлка» для 230 маленькіх наведвальнікаў. «Вясёлка» — першая дзіцячая дашкольная ўстанова ў горадзе з басейнам, дзе ўстаноўлена спецыяльнае абсталяванне для абеззаражвання вады. У садку створаны ўсе ўмовы для ўсебаковага развіцця дзяцей, умацавання іх здароўя: фізіятэрапеўтычны і масажны кабінеты, трэнажорная і фізкультурная залы, камп'ютарны клас, спартыўная і прагулачныя пляцоўкі.**

Падчас урачыстага адкрыцця старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Сямён Шапіра ўручыў сімвалічны ключ кіраўніку ўстановы Іне Якуцэні. Сямён Барысавіч падкрэсліў, што ўвядзенне ў дзеянне новага садка дапамагло вырашыць праблему недахопу месцаў у дашкольных установах горада. Разам з тым, як адзначыў кіраўнік цэнтральнага рэгіёна, пакуль гэтае пытанне застаецца актуальным у трох раёнах вобласці. «Але мы працуем над яго вырашэннем. Дзяржава і надалей будзе аказваць падтрымку маладым сем'ям і будаваць дзіцячыя садкі, каб у краіне нараджалася больш дзяцей», — сказаў Сямён Шапіра.

Па словах міністра адукацыі Беларусі Сяргея Маскевіча, у цэлым па краіне па выніках гэтага года плануецца адкрыць 16 дзіцячых садкоў. «Клопат аб дзецях — адзін з прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі, менавіта таму ў дашкольных установах ствараюцца камфортныя ўмовы для фізічнага і духоўнага развіцця дзяцей», — канстатаваў міністр.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## СВЕЖЫ ПОГЛЯД НА АРХІТЭКТУРУ

**Беларускі саюз архітэктараў праводзіць VIII Рэспубліканскі конкурс дыпломных праектаў сярод выпускнікоў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, якія рыхтуюць спецыялістаў у галіне архітэктуры, архітэктурнага дызайну і інтэр'ера. Выстава конкурсных работ адкрылася ўчора ў рэспубліканскім Доме архітэктараў.**

Для моладзі конкурс — гэта магчымасць прадэманстраваць самыя смелыя архітэктурныя рашэнні. Да слова, рамкі конкурсу пастаянна пашыраюцца. У гэтым годзе ў ім удзельнічаюць ужо 119 маладых архітэктараў — выпускнікі 8 ВНУ і 5 сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Прадстаўлены ўсе архітэктурныя школы.

Творчыя спаборніцтвы праходзяць у 10 намінацыях: «Горадабудаўніцтва», «Архітэктура жылых будынкаў», «Архітэктура грамадскіх будынкаў», «Архітэктура вытворчых аб'ектаў», «Сельская архітэктура», «Рэканструкцыя будынкаў», «Ландшафтная архітэктура», «Архітэктурны дызайн», «Дызайн гарадскога асяроддзя» і «Дызайн інтэр'ера».

Пераможцы конкурсу будуць абвешчаны 14 лістапада.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■

■ Грошы

# СТАЎКУ РЭФІНАНСАВАННЯ ВЫРАШЫЛІ «НЕ ЧАПАЦЬ»

**Праўленне Нацыянальнага банка прыняло рашэнне захаваць у лістападзе стаўку рэфінансавання на ўзроўні 20 працэнтаў гадавых.**

Спецыялісты галоўнага банка краіны ўпэўнены, што ва ўмовах пэўнага запаволення інфляцыйных працэсаў (за апошнія тры месяцы назіраецца зніжэнне прыросту спажывецкіх цэн) захаванне існуючага ўзроўню стаўкі рэфінансавання будзе садзейнічаць далейшаму стрымліванню інфляцыі, падтрыманню ўстойлівасці на валютным і дэпазітным рынках, а таксама забяспечыць прывабны ўзровень даходнасці рублёвых дэпазітаў.

У далейшым Нацыянальны банк працягне правядзенне працэнтнай палітыкі, накіраванай на падтрыманне фінансавай і макраэканамічнай стабільнасці, паведамляе прэс-служба НБ.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Жыллё

# «КВАДРАТ» ДЛЯ ЛЬГОТНІКАЎ ПРАКРЭДЫТУЮЦЬ НА 6,6 млн РУБЛЁЎ

## Налета ў краіне пабудуюць 5 млн квадратных метраў жылля

**Уладамі краіны на 2015 год устаноўлены адзіны гранічны нарматыў кошту квадратнага метра агульнай плошчы жылля для льготнага крэдытавання ў памеры 6,6 млн рублёў, паведамляецца ў пастанове Савета Міністраў ад 8 лістапада №1055.**

Таксама дакументам удакладняецца і гранічны кошт квадратнага метра жылля (не больш за 9,4 млн рублёў), для выдачы льготнага крэдыту Белаграпрамбанкам на будаўніцтва (рэканструкцыю) жылых дамоў (кватэр) у сельскагаспадарчых арганізацыях.

Стрымлівасць рост кошту будаўніцтва жылля з дзяржпадтрымкай і за кошт бюджэтных сродкаў мяркуецца дзякуючы выкарыстанню праектаў (серый) эканамічных жылых дамоў тыпавых спажывецкіх якасцяў. Пры фарміраванні праграм дзяржаўнага заказу на будаўніцтва (узвядзенне, рэканструкцыю) жылых памяшканняў планууецца максімальна ўжываць праекты такіх дамоў у буйнапанэльным выкананні. Пастанова прадугледжвае адпаведныя меры па аказанні ўсебаковага садзейнічання грамадзянам у будаўніцтве індывідуальных жылых дамоў, у тым ліку шляхам пашырэння асартыменту прадукцыі індустрыяльнага домабудавання для выкарыстання ў індывідуальным жыллёвым будаўніцтве і праз сістэму дапамогі ў забеспячэнні грамадзян будаўнічымі матэрыяламі.

Дакумент прадугледжвае пабудаваць у 2015 годзе 5 млн кв. м жылля, палова з якіх — з дзяржаўнай падтрымкай. Для шматдзетных сем'яў плануецца ўзвесці 346,4 тыс. кв. м. Істотна павінен павялічыцца і аб'ём будаўніцтва арэнднага жылля, якога налета плануюць узвесці ў памеры 460 тыс. кв. м. Пры гэтым дакументам прапісаны ўдзел суб'ектаў гаспадарання ў фінансаванні будаўніцтва жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання для прадастаўлення сваім работнікам на ўмовах дагавора найму. Аб'ём фінансавання жыллёвага будаўніцтва (без уліку інфраструктуры) прадугледжаны ў памеры каля 45 трлн рублёў, з якіх 21,6 трлн рублёў складуць уласныя сродкі насельніцтва.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Патэнцыял і перспектыва

# НАД БРЭСЦКАЙ КРЭПАСЦЮ — НА АЭРАСТАЦЕ

## 70% тэрыторыі славутай цытадэлі ніяк не выкарыстоўваецца

**У 2019 годзе Брэсту споўніцца тысяча гадоў. Лічба салідная, і да гэтай даты горад рыхтуецца ўжо сёння. Тым не менш, пакуль дакладна не вырашаны лёс Брэсцкай крэпасці. На фестывалі урбаністыкі, які праходзіць на гэтым тыдні ў сталіцы, прадставілі канцэпцыю комплекснага развіцця крэпасці і прылеглых гарадскіх тэрыторый пад назвай «Брэст-2019». Стварэнне праекта пачалося два гады таму пры падтрымцы Брэсцкага гарадскога выканаўчага камітэта і брастаўчаніна Уладзіміра Мікуліка. Зараз яго прасоўваннем займаецца мясцовая дабрачынная некамерцыйная арганізацыя «Фонд развіцця Брэсцкай крэпасці». Пакуль канцэпцыя па захаванні і развіцці Брэсцкай крэпасці была разгледжана Брэсцкім гарадскім і абласным выканаўчымі камітэтамі і атрымала станоўчыя водгукі і падтрымку. Наступны крок — яе ўзгадненне ў Міністэрстве культуры.**




На прапанаваным макеце добра відаць, што ўбачаць турысты з аэрастата.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Галоўная мэта праекта — стварыць на базе Брэсцкай крэпасці міжнародны гісторыка-культурны турыстычны цэнтр. «Перад распрацоўкай канцэпцыі мы правялі даследаванне ўсёй тэрыторыі і выявілі, што 70% не ніяк не выкарыстоўваецца, хаця яна мае вялікі турыстычны патэнцыял, — тлумачыць намеснік дырэктара па праектах «Фонду развіцця Брэсцкай крэпасці» Аліна ДЗЕРАВЯНКА. — Асноўная праблема крэпасці ў тым, што сёння яна не ўяўляе сабой цэласны ансамбль, гэта хутчэй разрозненыя часткі, якія варта звязаць у адно цэлае».

У самым пачатку работы над праектам спецыялісты фонду сутыкнуліся з тым, што ў крэпасці нельга будаваць, бо, па сутнасці, яе тэрыторыя — адна вялікая брацкая магіла. Таму яны вырашылі выкарыстоўваць іншы падыход — максімальна задзейнічаць ужо існуючыя забудовы, якія застаюцца без увагі і руйнуюцца. Ім дадуць другое жыццё. Напрыклад, у будынку штаба распрацоўшчыкі прапануюць стварыць маладзёжны валанцёрскі цэнтр.

«Усім вядомая адлегласць у паўтара кіламетра паміж крэпасцю і горадам ніяк не задзейнічана, і ствараецца ўражанне, быццам дзве часткі адарваны адна ад адной, — адзначае суразмоўца. — Гэтую тэрыторыю можна і патрэбна зрабіць прывабнай для турыстаў — адкрыць сувенірныя крамы альбо спецыяльны «візіт-цэнтр», дзе можна будзе атрымаць усю неабходную інфармацыю пра турыстычны аб'ект».

Працы шмат, таму «звязваць» аб'екты крэпасці ў адно цэлае будуць паступова. Рэалізацыя праекта запланавана ў два этапы. Да 2019 года асноўная ўвага будзе сканцэнтравана на аб'ектах міжнароднага тэматычнага парку «Брэсцкая крэпасць». Планы сапраўды грандыёзныя: першанцам стане музей фартыфікацыі пад адкрытым небам, куды ўвойдуць знакавыя помнікі архітэктуры — Заходні рэдут і капанір Гаўрылава. Адначасова будзе праводзіцца мадэрнізацыя археалагічнага музея «Бярэсце» і пабудова новага павільёна «Старажытнае Бярэсце». У параховым склепе Кобрынскага ўмацавання з'явіцца экспазіцыя «Брэсцкі мір». Паклапоцяцца і пра найбольш значныя аб'екты Валынскага, Цярэспальскага і Кобрынскага ўмацаванняў, якія будуць закансерваваны. Але галоўнай цікавінкай стане запуск аэрастата, які зможа падняць наведвальнікаў на вышыню 120 метраў. Незвычайная выстава расскажа пра зараджэнне паветраплавання ў Брэсце-Літоўскім.

Належная ўвага ў канцэпцыі надаецца развіццю інфраструктуры: будучаму комплексу патрэбны новыя пешаходныя і веладарожкі, і нават цэлы візіт-цэнтр «Заходнія вароты Беларусі». Распрацоўшчыкі хочуць стварыць асобную сістэму для зручнай навігацыі па крэпасці. Таксама прапануюць выдаць атлас крэпасці Брэст-Літоўск, які візуальна раскажа пра гісторыю яе будаўніцтва: у ім пазначаць усе аб'екты комплексу. Дарэчы, пры падтрымцы пасольскага фонду захавання культурнай спадчыны ЗША ў наступным годзе будуць праведзены даследаванні па інвентарызацыі фартоў крэпасці. Вынікам працы стане электронная база даных, якая ляжа ў аснову атласа.

Другі этап мадэрнізацыі тэрыторыі Брэсцкай крэпасці разлічаны да 2030 года, калі яна стане цэласным аб'ектам, дзе з'явяцца музейныя і адукацыйныя цэнтры, пляцоўкі пад адкрытым небам, сад цішыні на Цярэспальскім востраве, экалагічны і ландшафтны паркі.

**Кацярына РАДЗЮК**

■ На слыху

# КІРОЎЦА «ХУТКАЙ» ПАЦЯРПЕЎ ПРЫ ВЫКАНАННІ СЛУЖБОВЫХ АБАВЯЗКАЎ

**Машына хуткай дапамогі выехала на выклік у мікрараён Палессе горада Светлагорска. Патэлефанаваў медыкам мужчына, які спакойным голасам распавёў, што ў яго 46-гадовай маці тэмпература і слабасць. Літаральна праз некалькі хвілін раздаўся яшчэ адзін званок ад другога сына хворай. Узбуджаным голасам і ў агрэсіўнай форме 22-гадовы грамадзянін стаў распытваць дыспетчара, чаму дагэтуль няма брыгады. Наступны званок на падстанцыю «хуткай» быў ужо ад фельчара, якая ў слязах расказала пра тое, што кіроўцу машыны, што выехала на выклік, пабілі. Як высветлілася, менавіта той самы мужчына, які лаяўся з дыспетчарам.**

Намеснік начальніка Светлагорскага РАУС Яўген Клепік паведаміў, што пасля нанясення траўмаў пацярпеламу хуліган уцёк, таму не змаглі адразу правесці экспертызу на ўжыванне ім алкаголю. Пры гэтым сведкі здарэння гавораць, што хлопец быў п'яны. Пазней, калі ён знайшоўся, прызнаў, што не меў рацыі.

Цяпер кіроўца хуткай дапамогі знаходзіцца ў бальніцы з чэрапна-мазгавой траўмай і ўдарам галаўнога мозга. Праваахоўныя органы праводзяць неабходныя экспертызы. Прававую ацэнку дзеянняў хулігана неўзабаве дасць Следчы камітэт.

Галоўны пазаштатны спецыяліст упраўлення аховы здароўя па ахове працы Гомельскага аблвыканкама Ігар Арэхаў расказаў, што за бягучы год на Гомельшчыне здарыліся чатыры нападзенні на спецыялістаў, якія працуюць з хворымі. Разам з кіроўцамі хуткай дапамогі ахвярамі хуліганаў становяцца часцей за ўсё фельчары і санітары, якія працуюць з «буйнымі» пацыентамі.

— Пасля нападзення на нашага супрацоўніка праводзіцца медэкспертыза, і ў выпадку, калі траўма не вельмі цяжкая, пытанне аб завядзенні крымінальнай справы вырашаецца толькі па заяве пацярпелага. Але ж на справе не ўсе хочуць уцягвацца ў доўгія судовыя цяжбы... Пры гэтым кіраўніцтва ўстановы, наймальнік, згодна з заканадаўствам, не мае права падаваць заяву аб завядзенні крымінальнай справы. Цяпер нападзенне на медработніка лічыцца толькі хуліганствам і не з'яўляецца абцяжарвальнай віну акалічнасцю. На мой погляд, трэба нападзенне на медработніка адразу лічыць асаблівва небяспечным злачынствам, незалежна ад ступені цяжкасці атрыманых траўмаў. Хацелася б, каб нашы медыцынскія работнікі былі прыроўнены да работнікаў праваахоўных органаў у тым выпадку, калі яны атрымліваюць вытворчыя траўмы ад неправаамерных дзеянняў іншых асоб пры выкананні сваіх службовых абавязкаў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ**

■ Не стаў, дзе не трэба

# ЭВАКУАЦЫЯ АЎТО ПАДАРАЖЭЛА

**З сённяшняга дня ў сталіцы павышаюцца тарыфы на прымусовую адбуксіроўку транспартных сродкаў, а таксама на іх захаванне на стаянцы, якая ахоўваецца. Гэта прадугледжана рашэннем Мінгарвыканкама ад 30 кастрычніка №2767, якое афіцыйна апублікавана на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.**

Прымусовая адбуксіроўка (эвакуацыя) транспартнага сродку на стаянку, якая ахоўваецца, з поўнай пагрузкай на эвакуатар будзе каштаваць 430 тысяч рублёў (дагэтуль было 380 тысяч), з частковай пагрузкай — 350 тысяч (дагэтуль дзейнічаў тарыф у 300 тысяч рублёў).



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Калі гаварыць пра тарыф на захоўванне на стаянцы прымусова эвакуіраванага транспартнага сродку, дык на працягу 1-3 сутак ён складзе 60 тысяч рублёў за суткі, 4-10 сутак — 35 тысяч рублёў у суткі, а за 10 і больш сутак захоўвання — 25 тысяч рублёў у суткі.

Апошні раз павышэнне тарыфаў было летась у сакавіку.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

# З ГУСТАМ І СА СМАКАМ



Фота Наталлі Асмолы.




**У Мінску завяршае сваю работу XX юбілейная Міжнародная спецыялізаваная аптовая выстаўка-кірмаш «Продэкспа-2014». Шмат хто з кіраўнікоў прадпрыемстваў харчовай прамысловасці характарызуе яе як папярэдняе падвядзенне вынікаў года. У ліку экспанентаў — кампаніі не толькі Беларусі, але і Расіі, Літвы, Украіны, Польшчы, Латвіі, Славакіі, Харватыі, Францыі. Адна з самых буйных экспазіцый — у магілёўскага прадпрыемства «Чырвоны харчавік», якое працуе ў Бабруйску.**

— Мы заўсёды вельмі адказна рыхтуемся да «Продэкспа», — расказвае дырэктар Сяргей Анцюхоўскі. — Між іншым, у першым паўгоддзі займаем лідзіруючыя пазіцыі ў галіне. Хаця і праводзім рэканструкцыю і мадэрнізацыю. Усталёўваем новыя лініі, імкнёмся, каб новыя віды прадукцыі адпавядалі сусветным тэндэнцыям. Словам, абнаўляем густ пакупніка, стараемся задаволіць інтарэсы спажыўца.

У Беларусі, і нават за яе межамі, вядомы, напрыклад, мармелад, які выпускае «Чырвоны харчавік». Прычына — у непаўторным смаку, хаця і сыравіна выкарыстоўваецца традыцыйная, натуральная. Але, відаць, справа ў тым, што доля карысных натуральных кампанентаў у адзінцы тавару шмат вышэй, чым у падобнай прадукцыі іншых прадпрыемстваў. Такая акалічнасць даволі істотная. Ёй могуць кіравацца толькі ў тым выпадку, калі эканоміка суб'екта гаспадарання мае ўстойлівы характар. А гэта якраз і характарызуе адкрытае акцыянернае таварыства «Чырвоны харчавік».

— На пачатку 2015 года мы запускаем у вытворчасць яшчэ адну лінейку мармеладаў з дабаўленнем натуральных канцэнтраваных сокаў, — дзеліцца блізкімі планамі галоўны тэхнолаг прадпрыемства Іна Мацвейчук. — Для пачатку гэта будзе 5 найменняў прадукцыі. Мы выбралі самыя папулярныя смакі: апельсінавы, лімонны, клубнічны, вішнёвы, мультыфруктовы. У састаў



мармеладу ўваходзіць натуральны канцэнтраваны сок. Пасля дадазім яшчэ некалькі гатункаў, якія распрацоўваем з яблычным, малінавым смакамі. Клапоцімся і пра тое, каб наша прадукцыя спрыяла здароўю чалавека. У састаў мармеладу ўваходзіць пекцін, а менавіта ён выводзіць з арганізма чалавека таксіны, іоны цяжкіх металаў, радыенукліды, зніжае ўзровень халестэрыну.

Памкненні бабруйчан скіраваны і на зніжэнне сабекошту прадукцыі, што дазваляе прадпрыемству больш актыўна шукаць знешнія рынкі. І варта заўважыць, што гэта ў «Чырвонага харчавіка» атрымліваецца. І на выстаўцы-кірмашы «Продэкспа-2014» яго вырабы карысталіся нязменным попытам.

**Максім ЛАДЫМЕРАЎ.**

■ Бізнес-крокі

# СКЛАДАНА, АЛЕ МАГЧЫМА

## Субсідзіраванне інавацыйных праектаў: варыянты ёсць

**Сёння для прагрэсіўных прадпрымальнікаў адным з ключавых пытанняў з'яўляецца фінансавая падтрымка на пачатковым этапе, бо інавацыі не акупляюцца ў кароткатэрміновым перыядзе. Не ўсе ўдзельнікі бізнесу эфектыўна выкарыстоўваюць дзяржаўнае субсідзіраванне для развіцця вытворчасці тавараў і паслуг, неабходных у Беларусі. Гэта і стала падставай для таго, каб сабраць за адным сталом перамоў уладальнікаў інавацыйных праектаў і найбуйнейшых крэдытораў і лізінгадаўцаў Беларусі на семінары ў Мінску па стымуляванні інавацыйнага развіцця малога і сярэдняга бізнесу..**

### СТЫМУЛЯВАННЕ ІНАВАЦЫЙ

Летась доля суб'ектаў малога і сярэдняга бізнесу ў агульным аб'ёме ВУП склала 22,3%. Па ўдзеле прадпрымальнікаў у фарміраванні валавога рэгіянальнага прадукту мінулага года лідзіруе Мінск, дзе гэты паказчык дасягае 40,4%. Таксама мінскія прадпрымальнікі больш за ўсіх інвеставалі ў асноўны капітал мінулага года — каля 14,3%. Удзел малога і сярэдняга бізнесу ў знешнегандлёвым абароце склаў па Мінску каля 23,1%.

Для таго каб прастымуляваць гэтыя высокія паказчыкі, камітэт эканомікі Мінгарвыканкама з 11 лістапада 2014 года па 1 лютага 2015 года праводзіць конкурс інвестыцыйных праектаў малога бізнесу сталіцы. Праекты, якія перамогуць у гэтым конкурсе, атрымаюць фінансавую падтрымку ад дзяржавы ў выглядзе субсідый для кампенсацыі часткі працэнтаў за карыстанне банкаўскімі крэдытамі, а таксама часткі расходаў на выплату лізінгавых плацяжоў па дагаворах фінансавай арэнды. У конкурсе могуць прымаць удзел такія праекты, як стварэнне, развіццё і пашырэнне вытворчасці; арганізацыя, развіццё вытворчасці; рэалізацыя экспартаарыентаванай, імпартазамяшчальнай прадукцыі; вытворчасць прадукцыі, накіраванай на энерга- і рэсурсазберажэнне; укараненне новых тэхналогій.

Пакрыццё часткі працэнтаў за карыстанне банкаўскімі крэдытамі, атрыманымі ў беларускіх рублях, будзе ажыццяўляцца ў памеры не больш за 0,5 стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка Беларусі, устаноўленай на дату кампенсацыі працэнтаў, у замежнай валюце — у памеры не больш за 0,5 стаўкі па крэдыце. Пакрыццё будзе адбывацца ў беларускіх рублях па афіцыйным курсе Нацбанка Беларусі ў час прыняцця рашэння аб кампенсацыі працэнтаў, у межах тэрмінаў дзеяння крэдытных дагавораў. Пакрыццё часткі выдаткаў на выплатах лізінгавых плацяжоў па дагаворы фінансавай арэнды ў частцы аплаты сумы ўзнагароджання лізінгадаўца ў беларускіх рублях будзе ажыццяўляцца ў памеры, які не перавышае 0,5 памеру ўзнагароджання (даходу) лізінгадаўца. У выпадку набыцця аб'екта лізінгу за замежную валюту пакрыццё адбудзецца ў беларускіх рублях па афіцыйным курсе Нацыянальнага банка Беларусі.

### ГРАНТЫ ПА КОНКУРСЕ І Ў АБМЕЖАВАНАЙ ПРАПАНОВЕ

Крыніцай інвестыцый (як грантавых, так і на зваротнай аснове) служыць і Беларускі інавацыйны фонд. Як правіла, сродкі там выдаюцца на навукова-даследчыя і доследна-канструктарскія распрацоўкі. Не так даўно з'явілася фінансаванне на беззваротнай аснове з дапамогай ваўчараў і грантаў, а таксама венчурных праектаў. Дзякуючы гэтаму сёння можна казаць пра магчымасць фундатарства малога і сярэдняга бізнесу. Сума, якая выдаткоўваецца па ваўчарах, — ад 25 да 100 тыс. долараў. Але ёсць абмежаванне па тэрмінах: такія сродкі выдзяляюцца на год. Пры гэтым неабходна прадаставіць бізнес-план, згодна з якім будуць расходавацца грошы. Далей праект праходзіць экспертызу, а пасля гэтага на конкурснай аснове камісія вызначае, каму ж будзе накіраваны грант. Такая магчымасць з'явілася толькі ў гэтым годзе.

Інавацыйны фонд таксама ажыццяўляе субсідаванне на зваротнай аснове сродкаў. Грашовая сума прадастаўляецца на 5 гадоў. У 2013 годзе было прафінансавана 7 дагавораў суб'ектаў малога і сярэдняга інавацыйнага прадпрымальніцтва на суму 4,4 млрд рублёў.

Аднак бюджэт інавацыйнага фонду застаецца абмежаваным. Па словах **Андрэя ЦАНУНІНА, начальніка інавацыйных і венчурных праектаў**, на 2014 год падаваліся заяўкі на 140 млрд.

«Але з бюджэту першапачаткова запланавана было вылучыць толькі 69 млрд. Афіцыйна прыйшло 39 млрд рублёў. Ужо ў сярэдзіне года, з-за з'яўлення больш прыярытэтных праектаў, гэтая сума скарацілася. Зараз, каб закрыць патрэбнасць па бягучых запытах, неабходна каля 8 млрд рублёў», — растлумачыў Андрэй Цанунін.

### ІЛЬГОТЫ ТОЛЬКІ ПА ДЗЯРЖПРАГРАМЕ?

Лізінг вельмі прывабны для прадстаўнікоў малога бізнесу. Дзякуючы яго механізмам скарачаюцца выдаткі па тых фактарах вытворчасці, якія можна ўзяць у арэнду замест іх набыцця. Перавагі лізінгу — адсутнасць неабходнасці закладу на аб'ект лізінгу. А ў выпадку, калі прадмет лізінгу можна лёгка прадаць на другасным рынку, ад лізінгатрымальніка запатрабуюць толькі аванс. Гэтая сума складае ад 0% да 40% ад кошту лізінгавай уласнасці. У выпадку, калі прадпрымальнік карыстаецца аб'ектам лізінгу і яму неабходны дадатковыя банкаўскія крэдыты, то ён можа лёгка атрымаць іх. Лізінг не пагаршае структуру балансу. Таксама лізінг значна змяншае падатковую нагрузку прадпрыемства ў частцы падатку на прыбытак і на маёмасць.

Па словах **Аляксандра ЦЫБУЛЬКІ, старшыні савета Асацыяцыі лізінгадаўцаў Беларусі**, сёння дзяржава ў сваёй палітыцы па інавацыйных праектах заахвочвае толькі некаторых вытворцаў. У гэты белы спіс уваходзяць толькі найважнейшыя прадпрыемствы для эканомікі кшталту «МАЗ», «Geely». Для іх ёсць шэраг праектаў, па якіх выдзяляюцца крэдыты на льготных умовах, у тым ліку і для лізінгу.

«Адзіны спосаб хутка атрымаць ільготны крэдыт — гэта патрапіць пад дзяржпраграму. Інавацыйнаму прадпрымальніцтву сёння нялёгка працаваць у такіх умовах», — адзначыў Аляксандр Цыбулька.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

■ Новы фармат

# ЛІЧБА «ПРАПІШАЦЦА» Ў КОЖНЫМ ДОМЕ

## Аналагавае тэлебачанне адключаць да 15 мая

**Цяпер у Беларусі 97,81% насельніцтва маюць магчымасць прымаць эфірны тэлевізійны сігнал у "лічбе". Сёлета доля такога сучаснага тэлевізійнага «пакрыцця» стане больш за 98%, а да сярэдзіны мая наступнага года новы фармат тэлевяшчання стане даступным усім жыхарам нашай краіны, паведаміў учора начальнік упраўлення электрасувязі Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Павел ПЕТРУЛЕВІЧ.**

Увогуле, за час рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы па ўкараненні лічбавага тэлебачання было пабудавана 77 спецыяльных перадатчыкаў агульнай магутнасцю каля 115 кВт. Для гэтых людзей ужо сёння прадугледжана трансляцыя агульнадаступнага пакета (8 тэлевізійных праграм і адной гукавой), які прапануецца насельніцтву бясплатна.

Нагадаю, што для прыёму абавязковага агульнадаступнага пакета тэлевізійных праграм неабходны тэлевізар з падтрымкай стандарту DVB-T і фармату кадзіравання MPEG-4 або лічбавая прыстаўка з аналагічнымі параметрамі, якая падключаецца да звычайнага тэлевізара.

### ПЕРАХОД БЕЗ СУР'ЁЗНЫХ ЗАЎВАГ

Летась у краіне пачалося паэтапнае адключэнне аналагавага вяшчання. Першапраходцамі сталі чатыры раёны ў розных абласцях краіны (Асіповіцкі, Жлобінскі, Бабруйскі і Касцюковіцкі). Сёння ад «старой антэны" адключаны ўжо такія буйныя гарады, як Брэст, Віцебск, Гомель, Гродна і Магілёў. У гэтых гарадах сур'ёзных заўваг наконт перахода на "лічбу" ад насельніцтва не было. У кожным з раёнаў, дзе знікаў аналагавы сігнал, мясцовыя ўлады, Міністэрства сувязі і інфарматызацыі, Міністэрства інфармацыі зрабілі ўсё для таго, каб людзі не пацярпелі. Была аказана дапамога найбольш сацыяльна неабароненым слаям насельніцтва, праведзена актыўная кампанія ў сродках масавай інфармацыі. Таму ў людзей не было на гэты конт вялікіх праблем.

Прадстаўнік Мінсувязі і інфарматызацыі адзначыў, што па пытаннях, звязаных з пераходам на эфірнае лічбавае тэлевізійнае вяшчанне, можна звярнуцца да спецыялістаў адзінай бясплатнай даведачна-інфармацыйнай службы 172, якія дадуць неабходныя тлумачэнні і рэкамендацыі. Званкі са стацыянарнай тэлефоннай сеткі бясплатныя. Толькі сёлета ў гэтую службу паступіла ўжо больш за 24 тысячы званкоў.

### АПОШНІ ФАРПОСТ «АНАЛАГУ» ЗНІКНЕ ПАД МІНСКАМ

Наступныя адключэнні ад аналагавага фармата плануюць ажыццявіць 15 студзеня 2015 года, калі старое вяшчанне спыніцца на станцыях у Капылі, Мядзеле і Смаргоні.

Паралельна паўсюль, дзе цяпер адключаецца аналагавы сігнал, паступова пачынаюць працаваць так званыя камерцыйныя другі ці трэці мультыплексы. Чалавек у любым раёне нашай краіны ўжо сёння можа мець абсалютна бясплатна восем дзяржаўных тэлеканалаў, якія ўключаны ў абавязковы агульнадаступны пакет. Акрамя таго, пры жаданні будзе магчымасць і падключэння да камерцыйнага пакета. У дапаўненне да 8 асноўных будуць прапаноўвацца ад 20 да 45 каналаў у залежнасці ад тэхнічных магчымасцяў рэгіёнаў. Сёння паслугамі гэтых мультыплексаў ужо карыстаюцца больш як 42 тысячы абанентаў.

У Міністэрстве сувязі разлічваюць на тое, што да 2020 года ў Беларусі будзе каля 400 тысяч абанентаў камерцыйнага эфірнага лічбавага тэлебачання. Да мая 2015 года ўсе аналагавыя дэцыметровыя тэлевізійныя перадатчыкі будуць выключаны на ўсіх перадаючых станцыях краіны. «А 15 мая трансляцыя аналагавага сігналу будзе спынена і на галоўнай станцыі краіны — у Калодзішчах», — удакладніў Павел Петрулевіч.

**Сяргей КУРКАЧ**



**Разам з творчай камандай праекта «Наперад у мінулае» тэлеканала «Беларусь 3» мы пабывалі ў новых вандроўках у пошуках народнай песні ў беларускіх гарадах і вёсках. Кожная сустрэча на такім шляху ўзмацняе спадзяванні, што нас чакаюць новыя адкрыцці — і не толькі прыгожых галасоў і жыццёвых гісторый у песнях, але і людзей. Так і адбылося, калі мы завіталі ў горад Крупкі, каб паслухаць узорны дзіцячы фальклорны калектыў «Крупчаняты».**

Звязда. Наперад у мінулае. Сумесны праект «Звязды» і «Беларусь 3»

# ПЕСНЯ Ў СПАДЧЫНУ

…Заўважыўшы выстаўку народных строяў, зацікавілася, чыімі ж рукамі створана гэтая прыгажосць. І пакуль па традыцыі ўсе рыхтуюцца да сустрэчы з песняй, правяла невялікае даследаванне. Аказваецца, так свае таленты дэманструюць работнікі раённага Дома рамёстваў, які ў Крупках існуе ўжо больш за дзесяць гадоў. Паколькі калектыў у большасці жаночы, то займаюцца яны ткацтвам, вышыўкай, пляценнем з саломы. А вось Яніна Мікульчык з'яўляецца прыкладам таго, што любоў да ткацтва можна ператварыць у добрую традыцыю ў сям'і.

— У мяне бабуля і мама ткалі. Маці наогул працавала за станком да апошніх дзён. І мне любоў да гэтае справы перадалася. Я пачала займацца ткацтвам класа з чацвёртага. Спачатку стаяла за спінай у мамы, каб спасцігнуць майстэрства, а потым паціху і сама навучылася, — расказвае **Яніна Паўлаўна.** — Мая бабуля пражыла больш за 100 гадоў і нават тады працавала за станком, у грыбы магла пайсці і песні спявала. Яна прала і спявала, а ў нас жылі практыканты з бібліятэкі, дык яны заўсёды вельмі ўважліва слухалі яе. З мамай маглі вышываць адзін абрус на дваіх, нібы спаборнічалі паміж сабой.

Мае жанчына і свае ўзнагароды, сярод якіх адзнака на абласным фестывалі «Матчыны кросны» ў Старых Дарогах, на конкурсе «Беларускі пояс», што летам праходзіў ва Уздзе, — за крэатыўнасць у народных традыцыях, бо гэта была спроба саткаць пояс на кроснах.

Сведка сямейнай любові да ткацтва не толькі сама Яніна Мікульчык, а яшчэ і ткацкі станок, які яе маці перадала ў гісторыка-краязнаўчы музей, а потым яго аддалі ў дом рамёстваў. Сёння ён мадэрнізаваны: можа служыць і наглядным дапаможнікам на выставах, бо разбіраецца і збіраецца, што зручна пры перавозцы.

— Пры доме рамёстваў у нас працуе клуб народных майстроў «Таленты Крупшчыны», куды ўваходзіць 28 майстроў, 6 з якіх — з Саюза майстроў Беларусі. Там прадстаўлены таксама розныя напрамкі творчасці — вышыўка, ірландскія карункі, разьба па дрэве. Вось вы бачыце экспазіцыю адрэстаўраваных касцюмаў, прадметы побыту ў натуральным асяродку, — адгукаецца на маю цікаўнасць **намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Крупскага раённага выканаўчага камітэта Таццяна МЕЛЬНІК.**

Рэканструкцыяй народных строяў тут займаліся ў 2009–2010 гадах па тэхніцы і тэхналогіі, якая была ўласціва гэтай мясцовасці ў XIX — пачатку XX стагоддзя. Тут усё адпаведна часу і тканіны, і пашыў, і ўзоры — як было ў нашых продкаў. Яшчэ вас могуць навучыць рабіць неверагодных лялек, карціны са скуры альбо з воўны.



Прыцягваюць увагу і вянкі, якія тут прадстаўлены. Яны таксама рэканструяваны па ўспамінах, аповедах, фотаздымках свайго часу. Гэта галаўныя ўборы, якія дзяўчаты рабілі сабе на вяселле. Цяпер у калекцыі восем вянкоў. Лічылася, чым больш разнастайны па аздабленні вянок, тым багацейшая дзяўчына. Асобна вылучаецца адзін — ён чыста белы. Такія рабілі дзяўчаты-сіроты. Рыхтавалі перад вяселлем не толькі вянкі, але і прыданае: вышывалі ручнікі, пасцельную бялізну і многае іншае.

Дарэчы, на вяселле сёння звычайна замаўляюць торт, аднак быў час, калі падавалі кашу. А яшчэ ў Крупках захавалася адна цікавая традыцыя таксама звязаная з гэтай стравай. Бабіну кашу варыла спавівальная бабка, а пасля хрышчэння дзіцяці госці збіраліся дзяліць яе і адорваць малое. Каб весялей было, часам страву выкупляў хросны бацька, а грошы пераходзілі да хрэсніка…

Школьнікі па-рознаму ставяцца да народнай творчасці: адны прыходзяць паглядзець, іншыя спрабуюць і самі пераняць майстэрства. Напрыклад, унук Яніны Паўлаўны часта звяртаецца да яе з пытаннем, як зрабіць нешта. Акрамя таго, ён займаецца бісерапляценнем. Бабуля плануе, што калі ўнук падрасце (хлопчык вучыцца ў другім класе), яна навучыць яго ткаць пояс…



Вось чуецца дзіцячы гоман — значыць, юныя артысты ўжо гатовы паказаць сябе. Большасць тут таксама дзяўчаткі, але ёсць і некалькі хлопцаў. Спяваюць пераважна акапэльна, толькі ў некаторых песнях выкарыстоўваючы музычнае суправаджэнне. Калі зазірнуць у гісторыю ўзнікнення калектыву «Крупчаняты», то зноў будзе чакаць прыемнае адкрыццё: стварыла яго ў свой час бабуля цяперашняй салісткі Дар'і Сманцар.

— Я спяваю з чатырох гадоў, і любоў да музыкі ў мяне ад бабулі. Яна імкнулася пакінуць нешта пасля сябе. Заснавала не толькі наш калектыў, а яшчэ і ансамбль народнай песні «Крупчанка». Я ўдзельнічаю ў абодвух, — расказала пасля выступлення дзяўчына. — Нават калі дома нешта раблю, то таксама спяваю, і паступаць хачу ва Універсітэт культуры на народнае аддзяленне. І, ведаеце, мой талісман на сцэне — гэта бабуліна благаславенне.

Гэта ўжо другі склад дзіцячага калектыву, бо першыя ўдзельнікі ўжо выраслі, а другіх набрала цяперашняя кіраўніца Ганна Клімковіч. Яна займаецца і падборам песень для рэпертуару, некаторыя дапрацоўваючы, а іншыя перарабляючы. А як заўважыла салістка Дар'я, спяваюць «Крупчаняты» не толькі старажытныя песні, але і больш сучасныя. Аснова ўсё ж такі складаецца з традыцыйнай творчасці, у чым можна было пераканацца, паслухаўшы песні пра Каляду, пра жніво, пра гасціннасць і долю жаночую.

*…«А я, маладзенькая, не спала,*
*Госцейкаў чакала звечара.*
*Дарагія госцейкі вы мае,*
*Захадзіце ў госці да мяне.*
*Буду я вячэрачку гатаваць,*
*Сваіх госцейкаў частаваць.*
*Сваіх госцейкаў частаваць,*
*Шчэй дабра і здаровейка жадаць.*
*А я, маладзенькая, не спала,*
*Госцейкаў чакала звечара».*

Не толькі прыгожыя песні «Крупчаняты» спяваюць, але і на выступленні ездзяць на раённыя і рэспубліканскія святы. Нядаўна на абласным фестывалі «Напевы зямлі» яны ўзялі другое месца. Падумалі і пра наступную змену — гэта малодшая група «Крупчанят», дзеці з якой цяпер вучацца ў чацвёртым класе. Любяць юныя таленты і спяваць для сваіх, калі, напрыклад, калядуюць: прыбіраюцца ў касцюмы, хто казой, хто цыганкай, зайцам — і ходзяць па хатах віншаваць людзей са святам.

Сімвалічнай здалася адна з іх песень:

*«А мы грушу пасадзілі,*
*А я, маладзенька, топ, топ, топ.*
*А ўжо груша прынялася,*
*А я, маладзенька, топ, топ, топ.*
*А ўжо груша зелянее,*
*А я, маладзенька, топ, топ, топ.*
*А ўжо груша зацвітае,*
*А я, маладзенька, топ, топ, топ.*
*А ўжо грушу пара трэсці,*
*А я, маладзенька, топ-топ-топ».*

Яна хоць і народная, але ў выкананні «Крупчанят» адлюстроўвае жыццё і час у сваім развіцці: змяняюцца поры года, пакаленні, прыхільнасці… Але песня застаецца нязменна вечным спадарожнікам чалавека.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота аўтара.**

■ Хутка ў эфіры

## ФАЛЬКЛОРНЫЯ ВАНДРОЎКІ ПРАЦЯГВАЮЦЦА

**Апошні месяц восені на тэлеканале «Беларусь 3» таксама парадуе гучаннем народнай песні ў праграме «Наперад у мінулае». У бліжэйшы час гледачы разам з творчай камандай праекта пабываюць у гасцях у Петрыкаўскім і Жыткавіцкім раёнах. Адпаведна 16 лістапада адбудзецца знаёмства з фальклорным ансамблем «Купалінка» вёскі Церабаў, а 23 лістапада прадставіць сваю творчасць у вёсцы Запясочча фальклорны гурт «Запясочанка».**

Па добрай традыцыі праграма «Наперад у мінулае» не толькі паказвае творчасць калектываў, але і расказвае пра гісторыю мясцовасці, дзе зарадзілася і працягвае існаваць творчасць аматараў традыцыйнай песні, а таксама цікавыя легенды, звычаі і паданні Петрыкаўскага і Жыткавіцкага раёнаў.

Напрыклад, вы даведаецеся пра вёску Запясочча, якая ў пісьмовых крыніцах вядомая з XVIII стагоддзя як паселішча ў Тураўскай воласці Мазырскага павета Менскага ваяводства Вялікага Княства Літоўскага. А пачыналася яна з невялікага ўрочышча. З даўніх часоў вёска складалася з некалькіх частак: гэта Заяцелле (паводле падання, тут пасяліліся людзі, што прыйшлі з-за ракі Яцель); Дварэц (высокае месца, дзе знаходзіўся замак пана), Ладыча — поле (жыў калісьці ўладыка); Лука, Берыкава ды Масток. А яшчэ пачуеце пра вёску Церабаў Мышанскага сельсавета Гомельскай вобласці, што размяшчаецца на рацэ Трэмля (прыток Прыпяці). Недалёка ад населенага пункта, за дзесяць кіламетраў, знаходзіцца чыгуначная станцыя Мышанка. Паводле легенды, у Мышанцы жыў багаты пан, які наймаў сабе работнікаў з іншых вёсак, а на месцы Церабава ў тыя часы быў вялікі лес і балоты. Паслаў неяк пан тых сялян у балоты, лес церабіць. Выцерабілі яны балота пад паселішча ды пашу, а вёсцы далі назву Церабаў…



І, безумоўна, мы зможам пачуць новыя версіі аўтэнтычных песень. У выпадку з фальклорным ансамблем «Купалінка» выбіраць музычны матэрыял будзе госця праграмы — беларуская спявачка Аляксандра Гайдук *(на фота)*, а прыглядацца да прапанаваных гуртом «Запясочанка» песень будзе ўдзельніца гурта Da Vinchi Вольга Рыжыкава.

Які выбар зробяць «зорныя» госці праграмы і якую афарбоўку дадуць кампазіцыям, мы зможам убачыць ужо зусім хутка. Таму далучайцеся да прыхільнікаў беларускай песні і не прапусціце фальклорныя вандроўкі «Наперад у мінулае» ў эфіры тэлеканала «Беларусь 3» 16 і 23 лістапада.

**Алена ДРАПКО.**




# Галёпы з суржыка

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь-3» гульня «Размаўляем па-беларуску». Для таго, каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт http://tvrgomel.by або http://3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Папярэдне ж праверыць сваё веданне роднай мовы можна з дапамогай «Звязды».**

## Ці ведалі вы, што:

✓ **Ма́па** — геаграфічная карта.

✓ **Тамлёнка** — тушаная бульба.

✓ **Су́ржык** — мука з сумесі розных культур. Суржыкам яшчэ называюць украінскі аналаг беларускай трасянкі.

✓ **Гале́пы** — рытуальнае печыва з нагоды прылёту буслоў. Выпякалі галёпы з пшанічнай мукі ў выглядзе булачак або коржыкаў рознай формы і раздавалі дзецям.

✓ **Аксамі́т** — шаўковая тканіна з кароткім густым ворсам.

✓ **Рышто́к** — канаўка для сцёку вады. «Скрозь у полі снег пазганяла ў лагчыны і прыдарожныя рыштокі» — пісаў Кузьма Чорны ў рамане «Пошукі будучыні».

✓ **Абуць у лапці** — падмануць, ашукаць, абхітрыць. Рускія аналагі: «обводить вокруг пальца, втирать очки, водить за нос». Беларускія: «пускаць пыл у вочы, пускаць туман, плот гарадзіць».

✓ **Заліць за каўнер** — напіцца, часцей моцна. Яшчэ гавораць: наступіць на корак, набрацца, убачыць шклянога бога, закласці за гальштук, па-руску — «залить глаза».

Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» ***кожную суботу ў 11.10–11.25.***

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ■ Слухай сваё

# Гурт «Nuteki» выпускае альбом па частках

**Малады беларускі рок-гурт, які за апошнія некалькі гадоў здабыў папулярнасць таксама ў Расіі і Украіне, прадставіў прыхільнікам першую частку новага альбома і праілюстраваў яе кліпам. Свой першы цалкам англамоўны рэліз музыкі, праца над якім ішла пераважна ў ЗША, музыканты задумалі скласці з 4 частак і выпускаць па меры гатоўнасці.**

«Першая частка, The BGNNG, — гэта толькі пачатак гісторыі пра вялікую мару чалавека, якая адлюстроўвае і наш шлях да мары. Яна найбольш рокавая, поўная эмоцый, імпэту і задору, — тлумачыць лідар гурта Міхаіл Накарашвілі». Адпаведна, наступныя часткі альбома будуць адлюстроўваць увесь спектр пачуццяў чалавека, які спрабуе рэалізаваць сваю мару: боль, расчараванне, падзенні і, нарэшце, поспех. Незвычайнай стане і вокладка кожнай часткі альбома, якая будзе ўяўляць сабой выяву скульптуры. У The BGNNG гэта, напрыклад, матылёк, які выходзіць з кокана. Калі ж слухач збярэ ўсе чатыры вокладкі, то атрымае пятую, фінальную выяву. Усе часткі альбома, куды ўвойдзе каля 25 кампазіцый, павінны ўбачыць свет на працягу наступнага года.

Цікавасць прыхільнікаў да праекта артысты вырашылі падагрэць кліпам на песню «Wind Inside», які здымаўся ў закінутай сядзібе непадалёк ад Мінска. Паводле сюжэта, музыканты знаходзяцца ў розных частках вялікага дома, дзе кожны спрабуе спазнаць сябе.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# ПАНЯДЗЕЛАК, 17 ЛІСТАПАДА

## БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.25** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.05** Зона Х.
**9.10** Галоўны эфір.
**10.05** Клуб рэдактараў.
**10.45** «Зорнае жыццё». «Як забывалі зорак».
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**12.10 Меладрама «Здзіві мяне».**
**13.50, 15.50 Меладрама «Мой любімы геній». 1-я і 2-я серыі.**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**17.30** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**20.00** Форум.
**21.00** Панарама.
**21.45 Серыял «След».**
**23.50** Актуальнае інтэрв'ю.
**0.45** Дзень спорту.
**0.55** «Зорнае жыццё». «Тата на абцасах».

## БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 10.05, 21.30** Тэлебарометр.
**9.05, 16.35 Серыял «Сашка».**
**10.40** Пад грыфам «Вядомыя».
**11.10 Серыял «Мама — дэтэктыў». 1-я і 2-я серыі.**
**13.05 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**
**15.35** «Comedy Батл. Без межаў».
**17.50, 23.55 Серыял «Таксі».**
**18.50 Серыял «Універ».**
**20.55** Цела чалавека.
**21.25** КЕНО.
**21.35 Серыял «Віртуозы».**
**22.45 Баявік «Кулінар-2».**
**23.50** Хачу ў тэлевізар!
**0.25 Камедыя «Хачу вашага мужа».**

## БЕЛАРУСЬ 3

**7.15** «Дабраранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 13.40, 19.10, 0.40** «Калейдаскоп».
**8.10, 13.50, 19.20** «Музычны скарб Беларусі».
**8.20, 17.20** «Дыя@блог P.S.».
**8.45 «Чалавек на каленях». Драма.**
**10.30** «Французскі матыў маэстра Косма». Дак. фільм.
**10.55** «Размаўляем па-беларуску».
**11.00 «Прададзены смех». Фільм — дзецям.**
**13.15** «Старыя казкі». Гісторыя стварэння фільма «Прададзены смех».
**14.00 «Сябры». Драма.**
**15.50** «Камертон». Піяніст Сяргей Тарасаў.
**16.15, 23.35 «Плач перапёлкі». Драма.**
**17.45 «Пікавая дама». Драма.**
**19.30 «Севярына». Вестэрн.**
**20.45** «Калыханка».
**21.10** Хіт-парад. «Сто песень для Беларусі».
**22.00** «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
**22.30** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**22.55** «Подых струн». Госць: Піт Паўлаў.

## БЕЛАРУСЬ 5

**7.00** PRO спорт. Навіны.
**8.00** Баскетбол. Адзіная Ліга ВТБ. «Енісей» (Краснаярск) — «Цмокі-Мінск» (Беларусь).
**9.35** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Металург» (Жлобін) — «Шахцёр» (Салігорск).
**11.30** Тэніс. Кубак Паўлава. Адзіночны разрад. Жанчыны. Фінал.
**13.30** Тэніс. Кубак Паўлава. Парны разрад. Жанчыны. Фінал.
**15.35** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Рыга) — «Дынама» (Мінск).
**17.30** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. БГК імя Мяшкова (Беларусь) — «Заграб» (Харватыя).
**18.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**19.25** Хакей. КХЛ. СКА (Санкт-Пецярбург) — «Дынама» (Мінск).
**21.45** Час футбола.
**22.30** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Сіці» — «Манчэстэр Юнайтэд».

## АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.00** «Жыць здорава!».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.50** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.10, 16.15** «Час пакажа».
**16.50** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Адваротны адлік. «Вялікая вайна. Сыходзілі добраахвотнікі...».
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** «Справа прынцыпу».
**22.15 Драма «Леон».**
**0.45** Начныя навіны.

## СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.45** «Вялікае снеданне».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.40** «Сямейныя драмы».
**12.35** «Не хлусі мне!».
**13.50** «Вялікі горад».
**14.30** «Вялікія тайны Сусвету».
**15.40** «Іншая краіна». «Жывелі, Сербія?».
**16.20** «Наша справа».
**16.50** «Следакі».
**18.30** «Дзіўная справа».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Гарады, якія спяваюць». Дзённік. Другі паўфінал.
**20.20 Трылер «Сотавы».**
**22.10** «Глядзець усім!».
**23.00** «Тыдзень спорту».
**23.30** «Ваенная тайна».

## МІР

**6.00** «180 хвілін».
**8.45** «Беларусь сёння».
**9.10 Маст. фільм «Іншапланецянка».**
**10.30 Маст. фільм «З Днём нараджэння, Каралева!».**
**12.10 Серыял «У свеце ежы».**
**13.00, 16.00, 19.00, 0.30** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**13.15, 0.40 Серыял «Дарогі Індыі».**
**15.05, 2.25 Серыял «Тайныя знакі».**
**16.20** Ток-шоу «Слова за слова».
**17.10 Серыял «Людзі Шпака».**
**19.20 Серыял «Я вярнуся».**
**22.00 Маст. фільм «Мы памром разам».**
**23.40** «Навіны (бягучы радок) культуры».

## РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Прамы эфір».
**12.50** «Асаблівы выпадак».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.40** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Кузькава маці. Вынікі». «Атамная восень 57-га».
**16.40** «Касманаўтыка».
**17.15** «Уся Расія».
**17.50 Серыял «Сэрца зоркі».**
**18.50 Серыял «Пакуль станіца спіць».**
**20.50 Серыял «Каменская».**
**21.50, 23.50 Серыял «Мар'ін гай-2».**

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.20** «Пракурорская праверка».
**9.35, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.55** «Суд прысяжных».
**13.30** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.40** «Ядзім дома».
**15.10** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**15.40, 16.35 Серыял «Ляснік».**
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**20.00, 23.35 Дэтэктыў «Лягавы-2».**
**22.55** Анатомія дня.

## 8 КАНАЛ

**7.00, 13.10, 19.05, 20.55, 23.55** «Надвор'е».
**7.05, 16.05** Мультпарад.
**7.20** «Сёння клюе».
**7.50 Меладрама «Чалавек і яго сабака».**
**9.30 Серыял «Міс Марпл».**
**10.20, 16.30** «Кінаблакнот».
**10.30** «Кулінарныя парады».
**10.55 Баявік «Мяжа».**
**13.15 Серыял «Каралёк — птушка пеўчая».**
**15.20 , 18.45**»Тэлемагазін».
**16.30** «Кінаблакнот».
**16.40 Серыял «Эўрыка».**
**17.25** «Навіны».
**17.35 Серыял «Смерць у раі».**
**19.00** «Тэлепрагноз».
**19.10 Серыял «Цяжкі панядзелак».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00 Драма «Каралеўскі раман».**
**23.30 Серыял «Незямны сёрфінг».**

## ВТБ

**6.00** «PLAY».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 18.10, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00, 13.00, 19.30** Серыял «Кухня».
**9.30, 13.30, 19.00** Серыял «Аднойчы ў міліцыі».
**10.00, 20.00** Серыял «Варонiны».
**11.00, 4.30** «Непрыдуманыя гісторыі».
**12.00** Серыял «Метад Лаўрова».
**14.00, 18.30** «Лаві момант».
**14.30, 23.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**15.00** Серыял «90210: Новае пакаленне».
**16.00** Баявік «Бясстрашны».
**21.10** Драма «10 крокаў да поспеху».
**0.00** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «Зачараваныя».
**5.20** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».

## КУЛЬТУРА

**7.00** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.00, 23.55** Навіны культуры.
**10.15, 1.40** «Наглядальнік».
**11.15** «Расследаванні камісара Мегрэ». Серыял.
**12.05** «Вялікі містыфікатар. Казімір Малевіч». Дак. фільм.
**12.50** «Магазін на плошчы». Маст. фільм.
**15.10** Academia.
**15.55** «Жыццё папярок радкоў. Ганна Боўшэк». Дак. фільм.
**16.35** «Князь Пацёмкін. Святло і цені». Дак. фільм. Фільм 1-ы.
**17.05** «Мікіта Струве. Пад адным небам». Дак. фільм.
**17.45, 0.55** XIX стагоддзе. Выбраныя рамантычныя сімфоніі. Р. Шуман. Сімфонія № 1 «Вясновая».
**18.30** «Закахацца ў Арктыку». Дак. серыял. 1-я серыя.
**19.15** Галоўная роля.
**19.30** «Саці. Нясумная класіка...».
**20.10** «Правілы жыцця».
**20.40** «Добрай ночы, малыя!».
**20.50** «Рускія сезоны, або І цэлага свету мала». Дак. серыял.
**21.35** «Тым часам».
**22.25, 0.15** Глядзім... Абмяркоўваем... «Глыбокае каханне». Дак. фільм.
**2.40** «Сусветныя скарбы культуры».

## НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «КВЗ-64». Кафэ «Рамантыкі».
**7.30, 17.30, 20.40, 2.35** Канцэрт замежнай эстрады.
**7.50** Маст. фільм «Блакітныя гарады». 1985 год.
**9.00** «Музычны ліфт». 1991 год.
**10.00** Маст. фільм «Пра цябе».
**11.20** Творчы вечар Сымона Асіяшвілі «Будзе свята!». 1994 год.
**12.00** «Дзень цырка» на ВДНГ. 1967 год.
**13.00** Фільм-канцэрт «Спявае Ала Пугачова». 1981 год.
**13.30** «У гасцях у Мусліма Магамаева». Фрэнк Сінатра. 1992 год.
**14.30** Маст. фільм «Скарб».
**16.00** Праграма «А». 1990 год.
**17.00** «Пакуль усе дома». 1993 год.
**18.00** «...Да 16 і старэйшым». 1989 год.
**18.50** Фільм-канцэрт «Мелодыі Пахмутавай». 1976 год.
**19.25** «Гэты фантастычны свет». Літаратурная віктарына для школьнікаў. 1981 год.
**21.00, 3.00** «Мінулы час».
**22.00** «Народжаныя ў СССР».
**23.00** «Жанчына заўсёды права». 1-я частка. 1989 год.
**0.00** «Дванаццаты паверх». 1988 год.
**1.40** Тэлефільм «Следства вядуць знатакі».
**4.00** «Колба часу».
**5.00** «Кінапанарама». 1992 год.

## EUROSPORT

**10.30, 12.15** Аўта- і матаспорт.
**10.45** Чэмпіянат свету ў класе Турынг.
**12.30** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны.
**13.15** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
**14.00, 19.15, 0.30** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Жанчыны.
**15.00, 20.15** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны.
**17.00** Фігурнае катанне. Гран-пры. Кубак Расіі.
**19.00, 22.45** WATTS.
**22.15** Тэніс. «Матс пойнт».
**23.00** Пра рэслінг.
**1.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры.

## КАМЕДЫЯ

**6.00, 3.10** Серыял «Сваты 3».
**6.55** Камедыя «Дзяўчына з карабля».
**8.30** Камедыя «Молі і Мопс».
**10.00, 14.30, 17.30** Серыял «Прападобны».
**11.00** Меладрама «Спатканне ўсляпую».
**12.45** Камедыя «Дзякуй тата, дзякуй мама».
**15.30** Камедыя «Мой слуга Годфры».
**17.05, 0.45** Скетчком «Між намі».
**18.30** Меладрама «Экс-палюбоўнік».
**20.20** Камедыя «Мужчынская праца».
**22.00** Серыял «Нумар адзін спадар Кхан». Серыя 1—2.
**23.10** Камедыя «Віктар».
**1.15** Камедыя «Госць у доме».
**4.05** Меладрама «Нявеста, якая ўцякла».

## ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.30, 18.55, 2.15** «Каханне і пакаранне». Серыял.
**10.05, 4.25** «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
**11.50, 17.55** «Справа Астахава». Дак. серыял.
**12.45** «Свая праўда».
**13.40, 3.45** «Аўрора». Серыял.
**14.30** «Жонка. Гісторыя кахання». Марыя Стругацкая.
**15.50, 22.45** «Зорныя гісторыі».
**16.50** «Шчырая размова».
**20.45** «Берагі маёй мары». Серыял.
**21.45, 1.30** «Галоўны калібр». Серыял.
**23.45** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**0.35** «Часова даступны». Аляксандр Градскі.

## ТБ1000

**6.10, 14.10** Баявік «Каралі Дагтаўна».
**8.10** Фантастыка «Горад Эмбер: Уцёкі».
**10.10** Фантастыка «Машына часу».
**11.55** Трылер «Чырвоны дракон».
**16.10** Меладрама «Трыстан і Ізольда».
**18.20** Драма «Каханне і гонар».
**20.00** Камедыя «Сур'ёзны чалавек».
**21.55** Камедыя «Як страціць сяброў і прымусіць усіх цябе ненавідзець».
**23.55** Камедыя «Каханне з паведамленнем».
**1.50** Драма «Сёстры Магдаліны».
**4.00** Камедыя «Рэальнасць кусаецца».

## ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20, 1.50** Фантастыка «Цяжка быць богам».
**8.50** Камедыя «Правадыр разнаскурых».
**10.40** Меладрама «Са мною вось што адбываецца».
**12.05** Меладрама «Начныя забавы».
**14.30** Драма «Агні прытона».
**16.30** Камедыя «Адно каханне на мільён».
**18.30** Драма «Жыві і памятай».
**20.20** Камедыя «Нянькі».
**22.00** Баявік «Спіраль».
**23.50** Драма «Сібір. Манамур».
**4.20** Драма «Забава».

## NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Сканеры старажытнага свету.
**7.00, 13.00** Гульні розуму.
**7.30, 13.30** Займальная навука.
**8.00** Зрабі або памры.
**8.30** Навуковыя недарэчнасці.
**9.00, 14.00** 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала.
**11.00, 19.00** Мегазаводы.
**12.00, 20.00** Старацелі.
**16.00** Няўлоўная расамаха.
**17.00** Дзікая прырода Расіі.
**18.00** Вайна генералаў.
**21.00, 1.00, 4.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**22.00, 2.00, 5.00** Фашысцкі лагер смерці.
**23.00** Расследаванні авіякатастроф.
**0.00** Турэмныя цяжкасці.
**3.00** Апакаліпсіс. Другая сусветная вайна.

## DISCOVERY

**8.00, 10.35** Залатая ліхаманка.
**8.50** У пагоні за класікай.
**9.40, 14.15, 21.35** Як гэта ўстроена?
**10.10, 14.40, 21.05, 5.45** Як гэта зроблена?
**11.30, 6.10** Звышчалавечая навука.
**12.25, 17.25** Каралі аўкцыёнаў.
**13.20, 1.55** Top Gear.
**15.10, 4.55** Хуткія і гучныя.
**16.05, 7.05** Махінатары.
**18.20** Паўстанне машын.
**19.15** Як уладкаваны Сусвет.
**20.10** Дынама — неверагодны ілюзіяніст.
**22.00** Выжыць разам.
**23.00** Скаваныя.
**0.00** Голыя і напалоханыя.
**1.00, 4.05** Паляўнічыя на рэліквіі.
**2.50** Сапраўдныя аферысты.
**3.40** Маланкавыя катастрофы.

## СЕРАДА, 19 ЛІСТАПАДА

### БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.45 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.40, 0.15 Зона Х.
9.10, 21.45 **Серыял «След».**
11.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
11.05, 20.00 **Серыял «Зроблена ў СССР».**
12.10, 16.35 **Серыял «Сямейныя меладрамы-2».**
13.05 Дзень у вялікім горадзе.
14.00 **Серыял «Такое звычайнае жыццё».**
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
15.25, 1.15 **Серыял «Сваты 3».**
17.30 Беларуская часінка.
19.20, 0.25 Сфера інтарэсаў.
21.00 Панарама.
23.50 Актуальнае інтэрв'ю.
1.05 Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Раніца.
9.00, 21.30 Тэлебарометр.
9.05, 16.35 **Серыял «Сашка».**
10.10 «Fitnews».
10.45 **Баявік «Кулінар-2». Заключная серыя.**
11.50, 21.40 **Серыял «Віртуозы».**
12.55 Вышэй за дах.
13.30, 18.45 **Серыял «Універ».**
14.40, 23.55 «Разбуральнікі міфаў».
15.45 Рэпарцёр.
17.45, 0.50 **Серыял «Таксі».**
20.55 Цела чалавека.
21.25 Спортлато 5 з 36.
21.30 КЕНО.
22.50 **Дэтэктыў «Асабістыя матывы». 1-я серыя.**
23.50 Хачу ў тэлевізар.

### БЕЛАРУСЬ 3

7.15 «Дабраранак».
7.50 «Хачу ўсё ведаць!».
8.00, 12.50, 19.20, 2.05 «Калейдаскоп».
8.10, 13.00, 19.30 «Музычны скарб Беларусі».
8.20 **«Гусарская балада». Камедыя.**
9.50, 17.40 «Дыя@блог». «Пра мову».
10.15 **«Камедыя памылак». Камедыя.**
12.20, 14.05 «Размаўляем пабеларуску».
12.25, 0.30 «Святло далёкай зоркі». Памяці народнага артыста Беларусі Валерыя Раеўскага.
13.10 «Музеі Беларусі». Музей народнай архітэктуры і побыту.
13.35 «Наперад у мінулае».
14.10 «Збянтэжаны Саўка». Кароткаметражны фільм.
14.40 «У рэху імені твайго...» Анастасія Слуцкая.
14.50 «Край чыстай вады». Дак. фільм.
15.15 «Кніга лёсаў. Гаўрыіл Вашчанка. Такі, як ёсць». Дак. фільм.
16.10 «Навукаманія». Гарачая галіна.
16.35, 1.00 **«Плач перапёлкі». Драма.**
18.05 «Уладзімір Співакоў запрашае...» Оперны гала-канцэрт.
19.40 **«Экіпаж машыны баявой». Драма.**
20.45 Калыханка.
21.10 **«Загад: агонь не адкрываць». Драма.**
22.40 «Дыя@блог». «Пра прыгожае».
23.05 **«Загад: перайсці мяжу». Драма.**

### БЕЛАРУСЬ 5

7.00 PRO спорт. Навіны.
8.00 — **Тэхнічная прафілактыка.**
15.00 Хакей. КХЛ. «Ёкерыт» (Фінляндыя) — «Дынама» (Мінск, Беларусь).
16.55 Козел пра футбол.
17.10 Рэаліці-шоу «Mix Fight. Новыя гарызонты».
17.50 Гандбол. SEHA-ліга. «Веспрэм» (Венгрыя) — БГК ім. Мяшкова (Беларусь).
19.20 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
20.15 Баскетбол. Адзіная Ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» (Беларусь) — «Зеніт» (Расія).
22.00 Хакей. КХЛ. «Медвешчак» (Харватыя) — «Дынама» (Мінск, Беларусь).

### АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), 20.30 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 «Жыць здарова!».
10.25 «Кантрольная закупка».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Фазэнда».
11.50 «Модны прыгавор».
13.10 «Мужчынскае/Жаночае».
14.10 «Сам-насам з усімі».
15.10, 16.15 «Час пакажа».
16.50 «Давай пажэнімся!».
18.20 **Серыял «Зайцаў+1».**
18.50 «Няхай гавораць».
20.00 Час.
21.05 **Серыял «Усмешка перасмешніка».**
23.10 «Легенды Live».
23.50 **Маст. фільм «Іншы мужчына».**
1.30 Начныя навіны.

### СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
9.00, 13.50, 20.15 «Гарады, якія спяваюць». Дзённік. Другі паўфінал.
9.05 «Мінск і мінчане».
9.35 «Цэнтральны рэгіён».
10.05 «Аўтапанарама».
10.40, 17.30 «Званая вячэра».
11.35 «Сямейныя драмы».
12.35 «Не хлусі мне!».
13.55 **Камедыя «Оскар».**
15.30 «Татальны распродаж».
16.50 «Следакі».
18.30 «Нам і не снілася»: «Фальшывы рай».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.20 **Маст. фільм «Васількі для Васілісы».**
22.15 «Глядзець усім!».
23.00 «Гарачы лёд».
23.20 «Скардзіцца дазваляецца».
23.40 «Сакрэтныя тэрыторыі».
0.30 **«Меч». Серыял.**

### МІР

6.00 «180 хвілін».
8.45 «Зроблена ў СССР».
9.10 **Маст. фільм «Мама выйшла замуж».**
10.30 **Маст. фільм «Ярык».**
12.10 **Серыял «У свеце ежы».**
13.00, 16.00, 19.00, 0.30 Навіны Садружнасці (бягучы радок).
13.15, 0.40 **Серыял «Дарогі Індыі».**
15.05, 2.25 **Серыял «Тайныя знакі».**
16.20, 23.40 Ток-шоу «Слова за слова».
17.10 **Серыял «Людзі Шпака».**
19.20, 3.20 **Серыял «Я вярнуся».**
22.00 **Маст. фільм «Аазіс кахання».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
10.00 «Хто не пускае нас на Марс?».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.35 «Прамы эфір».
12.50 «Асаблівы выпадак».
13.50, 16.50, 19.50, 23.40 Навіны — Беларусь.
14.30 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
15.40 «Куды сыходзіць памяць?».
16.40 «Факты».
17.15 «Уся Расія».
17.50 **Серыял «Сэрца зоркі».**
18.50 **Серыял «Пакуль станіца спіць».**
20.50 **Серыял «Каменская».**
21.50, 23.50 **Серыял «Мар'ін гай-2».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00 «НТБ раніцай».
8.20 «Пракурорская праверка».
9.35, 10.20 **Серыял «Вяртанне Мухтара».**
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
11.55 «Суд прысяжных».
13.30 «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
14.40 «Справа густу».
15.10 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
15.40, 16.35 **Серыял «Ляснік».**
18.00 «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
20.00, 23.35 **Дэтэктыў «Лягавы-2».**
22.55 Анатомія дня.

### 8 КАНАЛ

7.00, 13.05, 19.05, 20.55, 23.35 «Надвор'е».
7.05, 16.00 Мультпарад.
7.30, 19.10 **Серыял «Цяжкі панядзелак».**
9.00, 17.30 «Навіны».
9.10 «Кінаблакнот».
9.30 **Серыял «Міс Марпл».**
10.30 «Адшукваецца адпачынак».
11.00 **Баявік «Чалавек-павук».**
13.10 **Серыял «Каралёк — птушка пеўчая».**
15.15, 18.45 «Тэлемагазін».
16.25 «TUT BY прадстаўляе».
16.45 **Серыял «Эўрыка».**
17.40 **Серыял «Смерць у раі».**
19.00 «Тэлепрагноз».
20.45 «Вечарніца».
21.00 **Трылер «Мёртвая маці».**
23.10 **Серыял «Незямны сёрфінг».**

### ВТБ

6.00, 5.50 «PLAY».
8.00 М/ф «Смяшарыкі».
8.30, 18.00, 0.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
9.00, 13.00, 19.30 Серыял «Кухня».
9.30, 13.30, 19.00 Серыял «Аднойчы ў міліцыі».
10.00, 20.00 Серыял «Вароніны».
11.00, 5.00 «Непрыдуманыя гісторыі».
12.00, 1.00 Серыял «Метад Лаўровай».
14.00, 18.30 «Лаві момант».
14.30, 23.15 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
15.00 Серыял «90210: Новае пакаленне».
16.00 Камедыя «Сабачае каханне».
21.10 Камедыя «Крутыя дзяўчаткі».



0.00 «Дурні і дарогі».
5.20 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».

### КУЛЬТУРА

6.30 «Еўраньюс».
10.00, 15.00, 19.00, 23.05 Навіны культуры.
10.15, 1.55 «Наглядальнік».
11.15, 23.25 «Расследаванні камісара Мегрэ». Серыял.
12.05 «Сусветныя скарбы культуры».
12.20, 20.10 «Правілы жыцця».
12.50 «Красуйся, горад Пятроў!».
13.20, 21.35 «Космас — падарожжа ў прасторы і часе». Дак. серыял.
14.05 «Казляня ў малацэ». Маст. фільм.
15.10 Academia.
15.55 Штучны адбор.
16.35 «Князь Пацёмкін. Святло і цені». Дак. фільм.
17.05 «Больш, чым каханне». Дзмітрый Мераджкоўскі і Зінаіда Гіпіус.
17.45, 0.55 XIX стагоддзе. Выбраныя рамантычныя сімфоніі. К. Сен-Санс. Сімфонія № 2.
18.20 «Неферціці». Дак. фільм.
18.30 «Закахацца ў Арктыку». Дак. серыял.
19.15 Галоўная роля.
19.30 «Абсалютны слых».
20.40 «Добрай ночы, малыя!».
20.50 «Рускія сезоны, або І цэлага свету мала». Дак. серыял.
22.20 Улада факта. «Дзяржава і дзеці».
0.10 «Уголас». Паэзія сёння.
1.30 «Дом мастацтваў». Дак. фільм.

### НАСТАЛЬГІЯ

6.00 «...Да 16 і старэйшым». 1989 год.
6.50 Фільм-канцэрт «Мелодыі Пахмутавай». 1976 год.
7.25 «Гэты фантастычны свет». Літаратурная віктарына для школьнікаў. 1981 год.
8.40, 19.10, 5.30 Канцэрт замежнай эстрады.
9.00, 15.00, 21.00 «Мінулы час».
10.00, 16.00, 22.00 «Народжаныя ў СССР».
11.00, 17.00 «Жанчына заўсёды права». 1989 год.
12.00 «Яловая субмарына». Гісторыя рускага рока». «Майк з гурта «Заапарк». 2005 год.
13.05 «Як гэта назваць?». Дак. фільм.
13.30, 19.35 Маст. фільм «Сумленне».
18.00 «Міжнародная панарама». 1979 год.
18.45 Фільм-канцэрт «Спявае Кола Бельды». 1977 год.
23.00 «Што хачу, тое і спяваю». Юбілейны вечар Л. Долінай. 1-я частка. 1993 год.
0.00 «Дзень цырка» на ВДНГ. 1967 год.
1.00 Фільм-канцэрт «Спявае Ала Пугачова». 1981 год.
1.30 «У гасцях у Мусліма Магамаева». Фрэнк Сінатра. 1992 год.
2.30 Маст. фільм «Скарб».
4.00 Праграма «А». 1990 год.
5.00 «Пакуль усе дома». 1993 год.

### EUROSPORT

10.30 Аўта- і мотаспорт.
10.45, 2.15 Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры.
13.00 Фігурнае катанне. Гран-пры. Кубак Расіі.
15.00, 21.00 Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
17.00 WATTS.
19.00 Дартс. Фінал.
20.30 Тэніс. «Матс пойнт».
23.00, 1.30 Выбранае па серадах.
23.05 Конны спорт.
23.40 Гольф. Тур PGA.
0.40, 1.15 Лепшае за месяц.
0.45 Гольф. Еўрапейскі тур.
1.20 Гольф-клуб.
1.25 Парусны спорт. Яхтклуб.
1.45 Чэмпіянат свету ў класе Турынг.

### КАМЕДЫЯ

10.00, 3.10 Серыял «Прападобны».
11.00 Камедыя «Віктар».
12.45 Камедыя «Мужчынская праца».
14.30, 17.30, 22.00 Серыял «Нумар адзін спадар Кхан».
15.30 Камедыя «Утаймаванне свавольных».
17.05, 0.55, 2.50 Скетчком «Між намі».
18.30 Камедыя «Укол парасонам».
20.20 Камедыя «Не злоўлены — не злодзей».



23.10 Дэтэктыў «І не чырванее».
1.15 «Мой слуга Годфры».
4.10 Меладрама «Спатканне ўслепую».

### ТБ3

6.00 М/ф.
7.50, 14.30 «Доктар I...».
8.20, 18.55, 2.10 «Каханне і пакаранне». Серыял.
9.55, 4.25 «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
11.45, 17.55 «Справа Астахава». Дак. серыял.
12.45, 16.55 «Шчырая размова».
13.40 «Аўрора». Серыял.
15.00, 0.30 «Каменская». Серыял.
15.55, 22.45, 3.40 «Зорныя гісторыі».
18.55, 2.10 «Каханне і пакаранне». Серыял.
20.45 «Берагі маёй мары». Серыял.
21.45, 1.20 «Галоўны калібр». Серыял.
23.40 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ТБ1000

6.00, 13.55 Драма «Джулі і Джулія: Гатуем шчасце па рэцэпце».
8.05 Драма «Каханне і гонар».
9.45 Меладрама «Трыстан і Ізольда».
11.55, 1.20 Баявік «Сетка».
16.00 Камедыя «Людзі ў чорным».
17.45, 3.30 Вестэрн «Легенда Зора».
20.00 Трагікамедыя «Два дні ў Парыжы».
21.55 Мюзікл «У рытме сэрца».
23.40 Трылер «Тормаз».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20, 2.20 Мюзікл «Стылягі».
8.40 Трылер «Цёмны свет».
10.30 Драма «Гогаль. Найбліжэйшы».
12.30 Драма «Юнацтва Пятра».
14.55 Драма «Жывы і памятай».
16.45 Драма «Сібір. Манамур».
18.35 Меладрама «У чаканні цуду».
20.20 Драма «Злачынства і пакаранне».
0.25 Прыгоды «Адно каханне на мільён».
4.40 Трагікамедыя «Баламут».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00, 11.00, 19.00, 21.00, 1.00, 4.00 Мегазаводы.
7.00, 13.00 Гульні розуму.
7.30, 13.30 Займальная навука.
8.00 Зрабі або памры.
8.30 Навуковыя недарэчнасці.
9.00, 14.00 Больш чым фокусы.
10.00, 15.00 Карысныя парады.
12.00 Золата Юкана.
16.00 Каралева тыграў.
17.00 Дзікая прырода Амерыкі.
18.00, 3.00 Вайна генералаў.
20.00 Старацелі.
22.00, 2.00, 5.00 Шаша праз пекла.
23.00 Расследаванні авіякатастроф.
0.00 Турэмныя цяжкасці.

### DISCOVERY

8.00, 10.35 Залатая ліхаманка.
8.50 Аўтападполле.
9.40, 14.15, 21.35 Як гэта ўстроена?
10.10, 14.40, 21.05, 5.45 Як гэта зроблена?
11.30, 6.10 Навука магіі.
12.25, 17.25, 22.00 Склады.
13.20, 1.55 Top Gear.
15.10, 4.55 Фабрыка ўнікальных аўто.
16.05, 7.05 Махінатары.
18.20 Поўны фарсаж.
19.15 Вялікі махінатар.
20.10 У пагоні за класікай.
23.00 Прапажы на продаж.
0.00 Бітвы за кантэйнеры.
1.00, 4.05 Багажныя войны.
2.50 Сапраўдныя аферысты.
3.40 Маланкавыя катастрофы.

## Гараскоп на

**АВЕН.** Добры час для наладжвання стасункаў з блізкімі. Можаце разлічваць на іх падтрымку, прычым не толькі маральную, але і матэрыяльную. Тыдзень спрыяльны для вырашэння фінансавых пытанняў. Да таго ж, калі ў першай палове тыдня вам удасца прывесці справы ў парадак, то бліжэй да яго канца з'явіцца магчымасць значна палепшыць сваё матэрыяльнае становішча. З адказнасцю падыдзіце да гэтага пытання.

**ЦЯЛЕЦ.** Варта быць стрыманымі ў словах і вельмі абачлівымі пры заключэнні здзелак, або калі вы вырашыце даць якое-небудзь абяцанне. Не абядзецца без кантактаў, якія, з аднаго боку, могуць абяцаць выгаднае супрацоўніцтва, а з другога — могуць абярнуцца для вас цяжарам і абавязацельствамі, якія будуць зусім недарэчы. Калі ўсё рабіць не спяшаючыся і абдумана, то на працягу тыдня зможаце ў значнай ступені паспрыяць паляпшэнню свайго матэрыяльнага становішча.

**БЛІЗНЯТЫ.** Вас, як і многіх іншых, закране фінансавае пытанне. Праўда, у вашым выпадку яно будзе выглядаць крыху інакш. У цэлым сітуацыя з грашыма будзе не дрэнная, але не зусім стабільная. Давядзецца зрабіць выбар, накіраваць сілы ў канкрэтнае рэчышча, і тады вы зможаце дасягнуць поспеху. Калі ж будзеце сумнявацца, паспрабуеце ўхапіцца за дзве справы адразу, то такія кіданні не прывядуць да добрага выніку, а толькі забяруць вашы сілы і час. Паспрабуйце быць больш настойлівымі і патрабавальнымі. Перш за ўсё да сябе.

**РАК.** Будзеце адчуваць сябе ўпэўнена і спакойна. І хоць могуць узнікаць мітуслівыя сітуацыі, моманты, калі спатрэбіцца хуткая рэакцыя, вы зможаце захаваць агульнае разуменне сваіх задач і мэты і спакойна выконваць іх, паступова прасоўваючыся наперад. Для працы тыдзень вельмі спрыяльны, вы можаце вырашыць многія пытанні. Бліжэй да выхадных чакаецца пацяпленне ў адносінах з блізкімі людзьмі, што дазволіць адпачыць і аднавіць сілы.

**ЛЕЎ.** Не выключаны паездкі, прычым яны могуць быць дастаткова далёкімі. Падарожжа прынясе нямала радасных момантаў, дазволіць расслабіцца і адпачыць. Наогул гэты тыдзень спрыяе таму, каб вы маглі забыцца на паўсядзённыя клопаты і аддацца фантазіям, летуценням. Таксама час спрыяльны для завязвання сяброўскіх кантактаў і сустрэч з людзьмі, зносіны з якімі вам будуць прыемнымі. Паспрабуйце не загружаць сябе справамі — для гэтага знойдзецца іншы час, а цяпер лепш за ўсё папоўніць запас сіл.

**ДЗЕВА.** Варта дзейнічаць па дакладным распарадку, у справах прытрымлівайцеся пэўнага плана, не варта кідацца з боку ў бок. Вельмі актыўны тыдзень. Можаце разлічваць як на запасы сваіх сіл і магчымасцяў, так і на падтрымку збоку, але паспяховасць праведзеных работ цалкам будзе залежаць ад вас. Каб не падвесці сябе і астатніх, неабходна расставіць прыярытэты і звесці ўсе канцы ў адну кропку. Ад таго, што выбіваецца з плана, варта адмовіцца.

■ Тэлесеткі

# ЯШЧЭ НЕ ПРОЙДЗЕНА ДАРОГА...

## СЁЛЕТА АНСАМБЛЬ «СЯБРЫ» АДЗНАЧАЕ 40-ГОДДЗЕ

**Тэлеканал «Мір» 15 лістапада прадставіць дакументальны фільм «Мая дарога», галоўным героем якога стаў народны артыст Беларусі Анатоль Ярмоленка. Сёлета адзначае сваё 40-годдзе беларускі ансамбль «Сябры», а хутка свет убачыць новы альбом калектыву «Дзе каліна цвіла…», аўтарам тэкстаў якога выступіў Іван Юркін, а кампазітарам — Алег Елісеенкаў. Таму сустрэцца з мэтрам беларускай эстрады і пагаварыць пра мінулае і надзённае стала проста ўдачай для стваральнікаў фільма.**



Нагода падвесці вынікі і азірнуцца на пройдзеную дарогу жыцця і творчасці, а таксама падзяліцца планамі на бліжэйшую будучыню ўвасобілася ў своеасаблівы фільм-маналог з разважаннямі вядомага артыста пра творчасць, перыяды станаўлення на сцэне, пра пэўныя складанасці, сучасную эстраду, а таксама пра асабістае — сям'ю, любоў да роднай зямлі.

Здымкі фільма доўжыліся каля двух тыдняў. У склад творчай каманды, якая працавала над ім, увайшлі аўтар сцэнарыя Вольга Забеліч, рэжысёр Дзмітрый Шынгур, прадзюсар Генадзь Салдатаў і аператары Аляксей Мартынаў і Кірыл Пасмурцаў. Сам галоўны герой, як адзначаюць удзельнікі здымачнай групы, аказаўся чалавекам вельмі кантактным, хоць і раскрыўся не з першай сустрэчы. Улічваючы, што Анатоль Ярмоленка чалавек заняты, сустрэчы з ім і інтэрв'ю часам рабілі проста ў аўтамабілі, каб не страціць бясцэнны час. Тое, што гледачы ўбачаць у 24-хвілінай версіі карціны, з'яўляецца толькі самымі цікавымі «выгрымкамі», а многія рэчы засталіся за кадрам.

— З Анатолем Іванавічам мы за час сустрэч абмяркоўвалі розныя пытанні, і матэрыялу назбіралася на гадзіны чатыры эфіру, калі казаць пра тое, што не ўвайшло ў канчатковую версію фільма,— дзеліцца сцэнарыстка Вольга Забеліч.— Напрыклад, калі разважалі пра папулярнасць, то ён згадаў адну кранальную гісторыю. Аднойчы на канцэрце ў Маскве да яго падышла жанчына з дзіцем і сказала, што назвала дачку Алесяй у гонар песні калектыву, а потым папрасіла патрымаць дзяўчынку на шчасце. А праз трыццаць гадоў тая самая Алеся прыйшла на канцэрт «Сяброў» у Крамлёўскім палацы і нагадала пра той выпадак… А бывалі ў творчасці і не лепшыя часы, калі, напрыклад, нельга было ні інструментаў знайсці, ні студыю нармальную для запісу… Тады яны дзейнічалі наступным чынам — выцягвалі «струну» з электрычных правадоў альбо з тэлефоннага кабелю, і нацягвалі яе, каб гучала… Я, калі падчас мантажу зноў паглыблялася ў матэрыял, то адзначала для сябе, што фільм дазваляе адкрыць вядомага ўсім артыста з розных і месцамі нечаканых бакоў.

***Не прапусціце прэм'еру на тэлеканале «Мір» 15 лістапада ў 15.25.***

**Алена ДРАПКО.**

## ПЯТНІЦА, 21 ЛІСТАПАДА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.20** Зона Х.
**8.50** Слова Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на Уводзіны ў храм Прасвятой Багародзіцы.
**9.10 Серыял «След».**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05, 20.00 Серыял «Зроблена ў СССР».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-2».**
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «Такое звычайнае жыццё».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 0.50 Серыял «Сваты 3».**
**17.25** «Terra incognita». Беларусь невядомая.
**17.55** Нашы.
**18.10** «Вялікі рэпартаж».
**21.00** Панарама.
**21.45 Прыгоды «Мушкецёры».**
**23.50** «Беларусь у развіцці».
**0.35** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 16.45 Серыял «Сашка».**
**10.10** Капейка ў капейку.
**10.45 Дэтэктыў «Асабістыя матывы».**
**11.40 Серыял «Віртуозы».**
**13.05** «Турыст».
**13.55 Серыял «Універ».**
**16.10** Вось гэта дзіва!
**17.55 Серыял «Таксі».**
**19.00 Баявік «Перавозчык».**
**20.45** Цела чалавека.
**21.25** КЕНО.
**21.30** «Бітва экстрасэнсаў».
**23.05** Рэпарцёр.
**23.55 Драма «Улада страху».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.10** «Дабранарак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 12.50, 18.40, 0.20** «Калейдаскоп».
**8.10, 13.00, 18.50** «Размовы пра духоўнае». Свята Ахвяраванне Найсвяцейшай Панны Марыі.
**8.25 «Дама з сабачкам». Драма.**
**9.50, 16.45** «Дыя@блог». «Правечнае».
**10.15 «Трое ў лодцы, не лічачы сабаку». Камедыя.**
**12.20, 19.05** «Размаўляем пабеларуску».
**12.25** «Персона». Аляксандр Збруеў.
**13.15** «Сіла веры».
**13.40** «Аўтограф». Вакальна-інструментальны ансамбль «Шкляры» шклозавода «Нёман».
**14.10** М/ф «Тайна далёкага вострава».
**14.35** «Музеі Беларусі». Музей народнай архітэктуры і побыту.
**15.00** «Званы часу. Сяргей Дадзівовіч». Дак. фільм.
**15.30** «Наша спадчына». Кларнет Яна Сабескага.
***Опубликованной 25 февраля 2014 г. в газете «Звязда»* по объекту Многоквартирный жилой дом неповышенной комфортности №3 по генплану с помещениями общественного назначения, подземной автостоянкой в квартале улиц Одоевского, Бельского, Пономаренко, П. Глебки (продолжение) в г. Минске.**

Общество с ограниченной ответственностью «Антасам» информирует о дополнении к проектной декларации объекта долевого строительства, *опубликованной в газете «ЗВЯЗДА» № 35 от 25 февраля 2014 г.:*

**Внести следующие дополнения:**

Абзац «Для привлечения физических, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей к строительству по договорам создания объекта долевого строительства предлагаются:» дополнить:

26 (Двадцать шесть) машино-мест в подземной гараж-стоянке. Цена 1 машино-места общей площади помещений общественного назначения в текущих ценах на момент опубликования проектной декларации составляет 171 840 000 (Сто семьдесят один миллион восемьсот сорок тысяч) белорусских рублей эквивалентной 16 000 долларам США по курсу, установленному Национальным банком Республики Беларусь на 12 ноября 2014 г.

*УНП 100727641*

**Отдел принудительного исполнения Первомайского района г. Витебска реализует путем проведения торгов имущество, принадлежащее**

**ООО СМП «Витебскэнергострой»,** а именно:

1. ЗИЛ-ММЗ-555, 1966 г.в. – стоимостью 9.760.000 рублей;
2. ГАЗ-53, 1993 г.в. – стоимостью 17.680.000 рублей;
3. Экскаватор ЭО 3323А, 1999 г.в. – стоимостью 80.000.000 рублей;
4. ЗИЛ-131, 1992 г.в. – стоимостью 39.760.000 рублей;
5. МАЗ 5337, 1991 г.в. – стоимостью 27.840.000 рублей;
6. ОДАЗ 93571, 1991 г.в. – стоимостью 9.840.000 рублей;
7. ЗИЛ-4502, 1987 г.в. – стоимостью 20.480.000 рублей;
8. МАЗ 54323, 2001 г.в., – стоимостью 49.360.000 рублей;
9. МАЗ 53373, 1993 г.в., – стоимостью 68.160.000 рублей;
10. ЗИЛ-431410, 1988 г.в., – стоимостью 13.600.000 рублей;
11. МАЗ 5549, 1982 г.в., – стоимостью 25.840.000 рублей;
12. Трактор МТЗ-82, 1994 г.в. – стоимостью 36.000.000 рублей;
13. Трактор Т-28, 1993 г.в. – стоимостью 21.680.000 рублей;
14. МАЗ 5337, 1992 г.в. – стоимостью 36.560.000 рублей;
15. Dacia Logan, 2006 г.в. – стоимостью 38.560.000 рублей.

**Данное имущество находится на территории ООО СМП «Витебскэнергострой» по адресу:** г. Витебск, ул. 1-я Заречная, 2.

**Торги по продаже данного имущества назначены на 26 ноября 2014 г. в 10 часов утра по адресу:** ул. Горбачевского, 26, каб. № 8.

Интересующую информацию можно получить в отделе принудительного исполнения Первомайского района г. Витебска каб. № 8, либо по **тел. 8 (0212) 60-01-39, 8 (0212) 37-46-38.**

*УНП 300002505*


# РУП «Институт недвижимости и оценки»

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**


**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона)**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА СО СНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ**

**по продаже изолированного нежилого помещения ресторана «Домашний круг»**

**с инв. № 110/D-2767184, расположенного по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, б-р Бородинского, 4/1-1 и принадлежащего ЗАО «Атлант»** (Продавец).

**Начальная цена с НДС – 9 729 683 040 бел. руб. Задаток с НДС – 97 296 830 бел. руб.**

*Задаток перечисляется на р/с № 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества ЗАО «Атлант» (ресторан), проводимом 10 декабря 2014 г.*

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 5 (пяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи Объекта.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) возмещает Продавцу в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона затраты на:

- определение рыночной цены Объекта в размере 4 375 300 (Четыре миллиона триста семьдесят пять тысяч триста) белорусских рублей с учетом НДС 20%;
- организацию аукциона, но не более 25 000 000 (Двадцати пяти миллионов) белорусских рублей.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 1% (одного процента) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Оборудование реализуется по отдельному договору купли-продажи при заинтересованности Победителя аукциона (Претендента на покупку).

В случае отказа Победителя аукциона (Претендента на покупку) от приобретения оборудования, срок вывоза оборудования Продавцом будет оговариваться в договоре.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Аукцион состоится 10.12.2014 в 11.00 по адресу:** г. Минск, пр-т Победителей, 61. Шаг аукциона – 5%.

**Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 08.12.2014 до 12.00 по адресу:** г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 2.

*Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 03.09.2014.*

С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона ino.by.

**☎ Дополнительная информация:**
**8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by.

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (организатор аукциона)
**по поручению Открытого акционерного общества «Слуцкий пивоваренный завод»** (продавец)

## ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**по продаже одним лотом имущества:**

здание административного корпуса, общ. пл. 2168.9 кв.м (инв. № 640/С-27293); весовая, общ. пл. 25.8 кв.м (инв. № 640/С-27303); переходная галерея, общ. пл.65 кв.м (инв. № 640/С-27304); элеватор, общ. пл. 1414.3 кв.м (инв. № 640/С-27309); главный производственный корпус, общ. пл. 12370 кв.м (инв. № 640/С-27312); проходная, общ. пл. 30.8 кв.м (инв. № 640/С-27313); незавершенное законсервированное капитальное строение, общ. пл. 440.2 кв.м (инв. № 640/U-72996); оборудование элеватора на земельном участке, площадью 3.1450 га по адресу: г. Слуцк, ул. Тутаринова, 1;
трансформаторная подстанция, общ. пл. 40,2 кв.м (инв. № 640/С-27297); насосная станция (станция 2 подъема), общ. пл. 116.9 кв.м (инв. № 640/С-51797) на земельном участке, площадью 0,1960 га по адресу: г. Слуцк, ул. Головащенко;
скважина № 8 (инв. № 640/С-27298) и ограждение.

**Начальная цена – 12 677 609 840 бел. руб. (стоимость снижена на 30%).** ***Задаток 10% от начальной цены (1 267 761 984 бел. руб.), перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».*** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель). *Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 16.08.2014.* Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. **Аукцион состоится 27.11.2014 в 10.00 по адресу:** г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются** по **26.11.2014 до 16.00** по указанному адресу.

**Тел: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (организатор аукциона)
**по поручению Открытого акционерного общества «Слуцк-Модуль»** (продавец)

## ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**по продаже имущества (в комплексе) в составе:**

| № | наименование | инв. № | общ. пл, кв.м |
|---|---|---|---|
| 1 | Здание инженерно-бытового корпуса инв. №98318 | 640/С-84380 | 10378,5 |
| 2 | Тепловые сети, инв. №98342 | 640/С-84368 | - |
| 3 | Площадка асфальтобетонная (инв. №98364) | 640/С-84443 | 1612,5 |
| 4 | Погрузочно-разгрузочная площадка (инв. №98365) | 640/С-84378 | 783,6 |
| 5 | Трансформаторная подстанция | 640/С-84444 | 37,7 |
| 6 | Сети водопровода (инв. №98340, инв. №98339, инв. №98341) | 640/С-84373 | - |
| 7 | Канализационная насосная станция (инв. №98330) | 640/С-84377 | 25,2 |
| 8 | Эстакада – площадка для мойки автомобилей | 640/С-84445 | - |
| 9 | Топливно-заправочный пункт (инв. №98327) | 640/С-84371 | - |
| 10 | Очистные сооружения дождевых стоков (инв. №98331) | 640/С-84365 | - |
| 11 | Градирня металлическая ККТ-35 (инв. №25301) | 640/С-84372 | - |
| 12 | Градирня металлическая ККТ-35 (инв. №25300) | 640/С-84367 | - |
| 13 | Контрольно-пропускной пункт | 640/С-84440 | 8,1 |
| 14 | Склад газовых баллонов | 640/С-84442 | 107,8 |
| 15 | Вспомогательный корпус часть инв. №98358 | 640/С-84381 | 1353,6 |
| 16 | Объекты благоустройства | 640/С-84370 | - |
| 17 | Главный корпус инв. №98319 | 640/С-84382 | 22590,0 |
| 18 | Здание вспомогательного корпуса инв. №98360 | 640/С-51701 | 335,7 |
| 19 | Склад тяжелых металлов | 640/С-39784 | 634,6 |
| 20 | Здание склада | 640/С-38241 | 535,9 |
| 21 | Производственное здание-котельная инв. №98361 | 640/С-51700 | 194,3 |
| 22 | Гараж со вспомогательным корпусом | 640/С-47756 | 1362,3 |
| 23 | Здание склада | 640/С-38242 | 2467,1 |
| 24 | Здание информационно-вычислительного центра | 640/С-38243 | 2393,6 |
| 25 | Автомонтажный корпус | 640/С-39783 | 8785,1 |
| 26 | Дренажная насосная станция (инв. №98329) | 640/С-84375 | 330,6 |
| 27 | Сети канализации (инв. №98626) | 640/С-84379 | - |
| 28 | Оборудование согласно перечню (перечень находится у организатора аукциона) | | |

Указанные объекты расположены на земельном участке, площадью 8,4478 га (предоставлен на праве постоянного пользования) по адресу: Минская область, Слуцкий район, г. Слуцк, ул. 14 Партизан, д. 101. Земельный участок имеет ограничения в использовании: зона санитарной охраны поверхностных и подземных источников водоснабжения хозяйственно-питьевого назначения на площади 8,4478 га. Имущество сдается в аренду (сведения об арендаторах можно получить у продавца и организатора аукциона).

**Начальная цена снижена на 50% и составляет с НДС – 39 150 542 400 бел. руб.**

***Задаток 5 % от начальной цены (1 957 527 120 бел. руб.) перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, УНП 690324015.***

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Фактические затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

*Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 02.10.2014.*

**Аукцион состоится 27.11.2014 в 11.00 по адресу:** г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

**Заявления на участие и необходимые документы принимаются** по 26.11.2014 до 16.00 по указанному адресу.

**Тел: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17.**

# РАЗГЛЕДЗЕЎШЫ ЧАС І ЗНАЙШОЎШЫ СЯБЕ



Юрыю Палякову — 60 гадоў. Галоўны рэдактар «Литературной газеты», яркі, цікавы празаік, не менш цікавы драматург, паэт, публіцыст… На памяці — яго кнігі «Задумаў я ўцёкі», «Дэмгарадок», «Неба паўшых», «Гіпсавы трубач», прыведзеныя ім у свет уражанняў героі. Героі з жыцця.

Чытаючы прозу Юрыя Палякова, сам-насам амаль з кожным творам задумваешся: «Ці ёсць у Палякова настальгія па ўчарашнім савецкім часе?..» Не адказаўшы і дагэтуль на такое, здавалася б, простае пытанне, я ўсё ж з піетэтам стаўлюся да светапогляду аўтара твораў, якія глыбока пранікаюць у жыццё. Аповесці, раманы, п'есы, якія разбіраюць, раскладваюць па паліцах многія сацыяльныя, грамадскія, духоўныя з'явы, уражліва і кранальна прымушаюць задумвацца над тым, што вакол нас — у блізкім і далёкім свеце. Юрый Палякоў умела, па-майстэрску аглядае рэчаіснасць і на дзіва дакладна трапляе ў цэль, закранаючы балючыя складнікі развіцця грамадства і асобы. Такіх падыходаў сёння ўвогуле не хапае мастацкай літаратуры, не хапае мастацкаму слову. У большасці літаратараў на паверхні знаходзіцца жаданне дагадзіць густу натоўпу, нейкага прыдуманага невядома кім сярэдняга чытача. Але ў іх разуменні сярэдні — гэта значыць ніякі: без перакананняў і без галавы, без здольнасці мысліць і прымаць рашэнні… Выходзіць, сярэдні — гэта чалавек-аўтамат, якому дастаткова аднаго: папіць, паесці, задаволіць фізічныя патрэбы… Мо таму вельмі часта многім «пасадным» чытачам і не падабаецца рухавы, узрыўны Палякоў?.. Мо таму так нялёгка прарываюцца ў тэатр яго п'есы?..

Асобная размова пра «Літаратурку»… Быў час, калі яна фактычна выпала з-пад увагі чытача. Рэзка знізіўся наклад. Зусім зніклі вострыя публікацыі. Сёння ж газета — на пад'ёме. І ў гэтым вялікая і найпершая заслуга галоўнага рэдактара. Яго хапае і на публіцыстычны агляд сучаснага жыцця. У Расіі і ва ўсім свеце. Доўгі час на старонках «Литературной газеты» выходзіў дадатак «Лад», большасць матэрыялаў якога была прысвечана сучаснай беларускай літаратуры. Дзякуючы гэтаму творчаму праекту многія паэты і празаікі ўбачылі свае творы ў перакладзе на беларускую мову (заўважым, што гэта адбываецца ў той час, калі істотна скарачаецца фармат перакладчыцкіх стасункаў). Калі многія аўтары, якія пішуць па-беларуску, проста застаюцца ў невядомасці перад больш шырокім колам чытачоў). «Лад» — гэта і ўважлівая да беларускага кнігавыдання медыйная прастора. А дзейнасць, запатрабаванасць гэтага творчага праекта — таксама вынік энергічнасці і руплівасці пісьменніка і журналіста Юрыя Палякова.

**Сяргей ШЫЧКО.**

# ПраМова (кіно)

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Адметныя фільмы былі ў конкурснай праграме. Але цяпер хочацца сказаць пра асобны цыкл пад назвай «Майстар-клас», у рамках якога паказваліся карціны рэжысёраў, якіх вылучае асаблівы погляд, асаблівы стыль, адметныя падыход да даследавання чалавека ў свеце. Цыкл, які прадстаўляе ўзорныя працы ў кіно, якія дэманструюць майстэрства рэжысёраў і дапамагаюць зразумець гледачу, што значыць выдатная праца ў кіно. Тут што ні імя — то асоба, адзначаная на шматлікіх конкурсах і фестывалях, ці асоба, адзначаная доўгім і плённым жыццём у мастацтве. Напрыклад, фільмы Аліўе Асаяса неадноўчы былі ў конкурснай праграме Канскага кінафестывалю (у Мінску паказвалася карціна «Зільс-Марыя»). Браты Жан-П'ер і Люк Дардэн здабылі славу класікаў сучаснага кіно, двойчы адзначаліся «Залатой пальмавай галінкай» у Кане. А тут такі падарунак — іх фільм «Два дні, адна ноч». Аргенцінскі рэжысёр Лісандра Алонса таксама прадстаўляў свае фільмы на Канскім кінафестывалі (у нас з'явілася магчымасць паглядзець «Хауха (Зямля асалоды)». Канадскі рэжысёр Дэні Аркан быў лаўрэатам прэміі Амерыканскай кінаакадэміі (за лепшы замежны фільм) і Міжнароднага канскага кінафестывалю. У цыкле «Майстар-клас» прадстаўлена яго кінастужка «Царства прыгажосці». Гэта гісторыі, расказаныя майстрамі.

Аднак кіно можа жыць без гісторый — яно само можа стаць гісторыяй. Яно можа раскрываць гісторыю чалавецтва ад яго нараджэння ў прыродзе, сталення і выжывання ў соцыуме, дзе ёсць небяспека, што ты ў натоўпе можаш адчуваць сябе адзінокім і незразумелым, калі губляюцца нябачныя ніткі, якія злучаюць людзей. Жан-Люк Гадар. Вялікі… Слова «рэжысёр» тут хочацца замяніць на слова «філосаф». Яго фільм (хочацца сказаць, філасофскі трактат) «Бывай, мова» сёлета — адна з галоўных кінападзей у свеце. І справа не ў тым, колькі прызоў і гледачоў за ім. Справа ў тым, што гэты чалавек здольны стварыць такое кіно, калі яно выходзіць за рамкі толькі мастацтва, хоць у ім ёсць своеасаблівы сінкрэтызм: адчуваецца яднанне вонкавых вобразаў з гукавымі (слоўнымі ці меладычнымі). Яно паказвае, што кіно — гэта не толькі адлюстраванне нейкіх фрагментаў жыцця, гэта асэнсаванне жыцця з фармулёўкай асноўных прынцыпаў суіснавання людзей (ці нагадванне пра іх?) у сучаснай рэчаіснасці.

Змадэляванае самімі людзьмі цывілізацыйнае ўпарадкаванне ў выніку забівае ў іх чалавечае, ператвараючы ў спажыўцоў (не толькі прадуктаў прыродных ці тэхнічных у выглядзе сучасных гаджэтаў, але і прадуктаў інтэлектуальных — кніг, фільмаў, думак, якія прамаўляюцца часта фармальна, холадна) у вытворцаў (тых жа розных прадуктаў), у носьбітаў сацыяльных роляў, з якіх выпадае сутнасць па меры таго, як слабее пачуццё любові да іншых (і ўжо невядома, людзі разам па інерцыі ці таму, што кахаюць). Чалавек, як вышэйшая зямная істота, можа вярнуцца ў той час, калі быў істотай прыроднай — калі з яго жыцця сыходзіць здольнасць разумець. Разумець іншых. Сябе і голас Бога ў Сусвеце. Разумець яго словы. І разумець словы тых, праз каго ён прамаўляў. І праз каго прамаўляе зараз (калі ёсць яшчэ каму яго слухаць). Можна ж без іх — без гэтых тамоў, напісаных вялікімі пісьменнікамі, якія пакутліва прыходзілі да нейкіх думак і дзяліліся імі. І якая розніца, што Салжаніцын называў гэта «вопытам мастацкага даследавання»? Можна выявы, створаныя вялікімі (Клодам Манэ, у прыватнасці), замяніць адной бясконцай карцінкай, якую прапануе тэлеэкран. Усё становіцца фонам — і карціны, і гукі, і словы. Да фону прывыкаеш і ў нейкі момант перастаеш яго заўважаць, нібыта нічога і няма. Адключаешся.

Выключаешся з сістэмы сімвалаў і знакаў, перастаеш разумець. Усё навокал насамрэч мае свае сімвалы, якія мы счытваем і нешта разумеем. Прырода мае свае (у прыватнасці, магутная інфармацыйная сістэма — вада) і гаворыць з намі. Ёсць сімвалы сакральныя, дадзеныя Богам, сувязь з якім страчваецца па меры таго, як губляецца сэнс малітвы. Мастацтва з намі размаўляе метафарамі, але іх жа ў наш вельмі канкрэтны час так складана расшыфроўваць. Мова. Асобная сістэма для стасункаў паміж людзьмі. І нават калі мы гаворым на адной мове, то не пазбаўлены небяспекі быць незразумелымі (ці не адсюль «не так сказаў», «не тое пачуў»?). Адсюль жаданне знішчаць незразумелае — асобныя знакавыя сістэмы, мовы, культуры ці наогул цэлыя народы. Фільм Гадара ілюструе некалькі сістэм, кожная з якіх важная ў свеце людзей: «Прырода», «Метафара», «Пра Мову». Гэта яго аўтарскае выказванне на мове кіно.



**Кадр з фільма «Бывай, мова».**

У гэтай мове ён карыстаецца рознымі сімваламі ці інструментамі. Напрыклад, інструментамі для яго з'яўляюцца людзі, героі, якія нібыта ёсць, за размовамі якіх мы назіраем. Але часта здаецца, што яны ёсць у гэтым фільме толькі для таго, каб агучваць нечыя цытаты. Іх гісторыя — толькі для таго, каб праілюстраваць думкі самога Гадара. І сучасныя кінаінавацыі — выключна для таго. Ён гуляе з папулярным фарматам 3D, як з мячыкам, перакідваючы яго на палову поля саперніка (па той бок экрана), дакладна ведаючы: у гэтай гульні важны не сам мячык і не тое, ловім мы яго ці не, хоць і гэта захапляе (о, чароўныя акуляры, здольныя ператвараць рэчаіснасць!). У гэтай гульні таксама ёсць сэнс, які вымушае разважаць: за кіно ў спалучэнні з шоу (калі плывеш за гэтай плынню) губляецца кіно як мастацтва (і як асаблівы спосаб даследавання жыцця). Губляецца магчымасць разумець кінаметафары, у якіх зашыфраваны думкі. Вось жа і шмат якія фільмы Гадара падаюцца незразумелымі і надта складанымі — кадры мільгаюць, мяняюцца, здаецца, абсалютна спантанна. Але толькі здаецца. Насамрэч няма ніводнага выпадковага (кожны ілюструе думку альбо слова), як няма выпадковых герояў ні сярод людзей, ні сярод жывёл. Так, вось жа дзіва: тых, хто так пакутліва імкнецца дастукацца да розуму і сэрца іншага, абодвух выдатна разумее сабака, які звязвае чалавека з прыродай і з іншым чалавекам і можа быць з тым вышэйшым розумам, які стварыў і адных, і другіх і даў ім магчымасць суіснаваць у адзіным свеце з разуменнем і любоўю. Што можа быць сёння больш актуальным, чым мова любові, якую мы таксама перастаём разумець. Мова Гадара. Мова, якая яшчэ жыве ў кіно.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

■ Неасабісты суб'ектыў

# У РАННІХ ПРЫЦЕМКАХ



## Вусцішнай парой так хочацца пагаварыць з блізкім чалавекам. А калі няма з кім?..

У Петрыкаве на гэтым тыдні распачалося судовае слуханне па факце жудаснага забойства 83-гадовай бабулі, якое ў сакавіку скаланула вёску Малыя Сялюцічы і ўсё наваколле. Трое здаровых мужыкоў закатавалі бабулю да смерці: звязалі скотчам, білі, зламаўшы нос і рэбры, душылі. Шанцаў абараніцца і выжыць у старой нямоглай жанчыны не было: жыла яна адна, да таго ж была інвалідам — адмарозіла ногі, засталася без ступняў. Збірала грошы на пратэзы — іх і выбівалі недавяркі ў няшчаснай. Ператросшы ўсю хату і не дабіўшыся ад ахвяры прызнання, яны прыхапілі з сабой некалькі бутэлек віна і пакінулі яшчэ жывую бабку паміраць. Знайшла яе назаўтра суседка, якая зазірнула аддаць невялікую пазыку…

«Залётных» злачынцаў вылічылі і затрымалі хутка — дапамаглі пільныя аднавяскоўцы забітай жанчыны. Цяпер трэба толькі спадзявацца, што пакаранне будзе адпаведнае жорсткасці і цынізму, з якімі яны катавалі старога чалавека. Зрэшты, паразважаць у гэтай гісторыі хочацца не пра жорсткасць і цынізм, якія, калі не будзем ім супрацьстаяць, хутка завалодаюць нашым жыццём і паселяць у душах страх. Тут трэба гаварыць пра «пускавы механізм» адной асобна ўзятай трагедыі — пра тое, чаму прагныя да лёгкай нажывы людзі пайшлі менавіта ў тую хату, пра тое, з чаго ўсё пачалося…

А пачалося ўсё, як высветліла следства, з заезджых «карабейнікаў», якія на старых «жыгулях» раз'язджалі па наваколлі, прапануючы яркія анучы па ну вельмі невялікіх цэнах (падобных смуглявых гандляроў ведаюць, пэўна, у кожнай беларускай вёсцы). Зайшлі і ў хату на ўскраіне Малых Сялюціч, да бязногай бабулі. Кабета, што прынесла прапаноўваць стракаты тавар, была такая мілая і прыветлівая, а адзінокай бабцы так хацелася пагаварыць… Слова за слова — расказала нязванай госці і пра сваю бяду з нагамі, і пра тое, як збірае грошы на пратэзы, каб хоць па двары можна было пахадзіць. Тая слухала, спачувальна ківала, зазірала прыхільна ў вочы. А потым паспяшалася расказаць хаўруснікам пра ўдалую «разведку боем»: маўляў, грошы ў бабулі ёсць, жыве адна, хата наводшыбе, сабакі ў двары няма. «Пускавы механізм» спрацаваў, і злачынцы, амаль упэўненыя ў беспакаранасці, паехалі па лёгкую здабычу.

НЯДАЎНА давялося пачуць падобную гісторыю з родных мясцін — дзякуй Богу, не з такім трагічным фіналам. Фігуранты ўсё тыя ж — заезджыя махляры і бабуля, якая хацела чалавечай спагады і ўвагі. Бабка жыве не адна — з сынам, нявесткай і ўнукамі. Але адны цэлы дзень на працы, другія — на вучобе, пра старую толькі адзін клопат: каб была накормленая ды абмытая. Увечары адны ў тэлевізар, другія — у камп'ютар, а 82-гадовая жанчына сядзіць у сваёй бакоўцы і ўспамінае маладыя гады. «Адна, дзіцятка, як воўк», — скардзілася мне ўлетку. Пэўна, пра тое расказвала і гаваркім кабетам, што без перашкоды зайшлі ў хату са сваімі клятчастымі клункамі. Разгарнулі тавар, папрасілі папіць вады… Бабуля, шчаслівая, што знайшла кампанію ў ранніх восеньскіх прыцемках, прапанавала не вады, а гарбаты, утульна ўселіся за стол, уважліва слухалі яе ўспаміны і трывогі. Праўда, як пачулі, што неўзабаве прыйдзе з працы сын, заспяшаліся, шчабечучы-дзякуючы, выкаціліся з хаты, селі ў абшарпаны «масквіч»… Пры гэтым умудрыліся сцягнуць з хаты бабчыну пенсію, што ляжала ў шафе пад бялізнай, і электрычны чайнік — той самы, у якім гаспадыня ім ваду для чаю гатавала…

Кажуць, сын і нявестка бабцы добры скандал учынілі, тая пасля цэлы дзень праплакала і паштальёнцы — зноў жа хоць і знаёмаму, але зусім чужому чалавеку — пра гэту сваю бяду доўга расказвала. І, я амаль упэўнена, — нікога нічому гэтая гісторыя не навучыла: ні бабулю, якая і надалей будзе цягнуцца да незнаёмых людзей, што праяўляць да яе ўвагі больш, чым блізкія сваякі, ні гэтых самых блізкіх сваякоў, настолькі занятых такімі важнымі ўласнымі справамі, што ім няма ні часу, ні патрэбы пагаварыць са старой маці. Не толькі пра тое, што не варта выварочваць душу перад чужымі, але і пра былыя часы, і пра тое, што яна сёння пачула па радыё, і куды сусед уранку вёў сваю карову… Бабка — чысценькая, смачна накормленая, зноў сядзіць вечарамі ў бакоўцы. І калі з прыветлівай усмешкай на парозе з'явіцца незнаёмы гандляр, як вы думаеце, яна здолее сказаць яму: «Ідзі прэч!»?

НАШЫ састарэлыя бацькі — людзі іншай эпохі. Яны больш даверлівыя, больш шчырыя ў адносінах, яны не могуць і не хочуць падазраваць усіх і кожнага ў тым, што ён махляр або злачынца. «Вельмі крыўдна за адзінокіх старых, якія ў пошуках увагі гатовыя расказаць аб сваіх праблемах першаму сустрэчнаму, які можа мець нядобрыя намеры. Злачынцы незаўважна выпытваюць пра наяўнасць грошай, блізкіх сваякоў, заўважаюць, як умацаваны дзверы, ці ёсць у двары сабака», — гаварыў начальнік УУС Гомельскага аблвыканкама, каменціруючы жудасную трагедыю ў Малых Сялюцічах. Ад сябе дадам: «адзінокія» — гэта не толькі тыя, хто застаўся пад старасць адзін па волі лёсу. Адзінокімі сваіх старых робім мы самі, калі думаем толькі аб іх фізічным дабрабыце. Асабліва гэтай вусцішнай халоднай парой, калі самі шукаем цеплыні і разумення, ідучы з сябрамі ў кавярню, каб проста пагаварыць па душах, ці гадзінамі «завісаючы» на тэлефоне з сяброўкай. Забываючыся, што недзе ў вясковай хаце маці чакае званка. Або ў суседнім пакоі глядзіць свой вечны серыял, які ўжо забылася, з чаго пачынаўся…

…НЕЯК за працай забегалася, і некалькі вечароў, калі мама клапатліва пытала, як справы, як прайшоў дзень, кідала ў адказ адно: «Нармальна». А пра яе дзень, пра цэны ў крамах, пра тое, што ўбачыла ў навінах, — слухала на паўвуха, адным вокам кідаючы ў талерку з вячэрай, другім — у манітор камп'ютара. Наступствы не прымусілі сябе чакаць. «Тут такія дзяўчаткі мілыя прыходзілі. Я іх запрасіла, чайку папілі, пра жыццё, пра Бога пагаварылі, кніжкі во пакінулі», — з парога ашаламіла мяне мая Васільеўна, паказваючы літаратуру сведак Іеговы.

Дзякуй Богу, гэтым разам абышлося. Дай мне, Божа, розуму, каб наступнага разу не было.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ** ■

# «ПРЫГАРШЧЫ ПУНСОВЫХ ЖУРАВІН»



**Па гарызанталі:** **4.** «Асенні ... — у шале характва,\\Рабіна на сябе парчу надзела». З верша С.Грахоўскага «Колеры». **8.** «Янка сее ...,\\А я журавіны». З беларускай народнай песні «Стаіць Янка на гары». **9.** «Ой, там хадзіла красна ... ,\\Ягады брала». З беларускай народнай песні «Ой, зарадзілі сільна, буйна». **11.** Чужына — каліна, ... — маліна (прык.). **14.** Апантаны азартнымі гульнямі. **16.** «Гляджу, а восень села ля абочыны,\\ ... сабе саткала з павуціны\\І дзівіцца:\\Зноў асака адскочыла\\І на балоце спеюць журавіны». З верша Ю.Свіркі «Восень». **17.** «Ты чуеш, ... мой, як плачуць журавы\\Пад зарывам асенніх журавін?». З верша П.Панчанкі «Журавы». **18.** Брус, забіты ў грунт для апоры ў збудаваннях. **19.** Засеянае поле. **22.** «Дзе на прыпёку першыя суніцы\\Паказваюць ружовенькі ...». З верша С.Законнікава «Суніцы». **23.** «Зняла памалу хустку з галавы,\\Падала ..., поўны журавін». З паэмы М.Танка «Журавінавы цвет». **25.** Дэталь хадавога механізма гадзінніка. **29.** «Журавіны бяруць жанчыны,\\Імі ўсыпана ўсё ...». З верша Э.Акуліна «Журавіны бяруць жанчыны». **31.** Бацькі елі журавіны, а ў дзяцей ... на зубах (прык.). **32.** Цэнтр адміністрацыйнага раёна на Брэстчыне, дзе праводзіцца свята журавін; такое ж свята адзначаюць і на Мёршчыне. **33.** Ядавітая змяя.

**Па вертыкалі:** **1.** Створка для прыкрыцця знадворку акна. **2.** Салодкая страва з узбітай да пены ягаднай, фруктовай, малочнай масы. **3.** Від тэатральнага мастацтва. **5.** ... — дасужы, ды не дужы (прык.). **6.** Адрывісты гук, стук. **7.** «... на грыбы не скупіцца,\\Пуні хмялеюць ад сена». З верша М.Танка «У беларускую восень». **10.** Кавалак хлеба, адрэзаны ад непачатага краю. **12.** «І нясу я ў прыцемках халодных\\... пунсовых журавін». З верша А.Ляўковіч «Журавіны». **13.** «Чырвоная ...\\На купінцы спее.\\Адзін мяне пацалуе,\\А чатыры млеюць». (прыпеўка). **15.** «... мой журавінны!\\Край мой родны пазнаю». З верша Р.Крушыны «Журавіны». **17.** Назва ягады буякоў, якія, як і журавіны, растуць на мохавых балотах. **20.** Позняй восенню адна ягада, ды і тая — горкая ... (прык.). **21.** Якая ягада, такое і ... (прык.). **24.** Доўгі падол жаночай сукенкі, які цягнецца ззаду. **26.** Паніжэнне ва ўзроўні. **27.** Драматычны твор. **28.** Напітак з журавін, ужыванне якога рэкамендуецца для прафілактыкі ракавых захворванняў. **30.** «У паветры пах\\Ад іх носіцца,\\Сама ягада\\У ... просіцца». З паэмы Я.Коласа «Міхасёвы прыгоды» («Ягады»).

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ. г.Дзяржынск.**

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** 4. Сад. 8. Кавуны. 9. Дзеўка. 11. Радзіма. 14. Ігрок. 16. Вянок. 17. Дружа. 18. Паля. 19. Ніва. 22. Бачок. 23. Кошык. 25. Анкер. 29. Палессе. 31. Аскома. 32. Столін. 33. Эфа.

**Па вертыкалі:** 1. Аканіца. 2. Мус. 3. Цырк. 5. Адзін. 6. Удар. 7. Лес. 10. Акраец. 12. Прыгаршчы. 13. Журавінка. 15. Кісялёк. 17. Дурніца. 20. Рабіна. 21. Варэнне. 24. Шлейф. 26. Спад. 27. П'еса. 28. Сок. 30. Рот.

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.34 | 17.13 | 8.39 |
| Віцебск — | 8.29 | 16.57 | 8.28 |
| Магілёў — | 8.25 | 17.03 | 8.38 |
| Гомель — | 8.15 | 17.05 | 8.50 |
| Гродна — | 8.49 | 17.29 | 8.40 |
| Брэст — | 8.43 | 17.36 | 8.53 |

### Месяц

*Апошняя квадра ў 18.15.*
*Месяц у сузор'і Льва.*

### Імяніны

*Пр. Ульяны, Аляксандра, Дзмітрыя, Івана, Сяргея, Фёдара, Якава.*
*К. Андрэя, Лаўрэнція, Уладзіміра, Юзафа.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## Любы капрыз

# Новы год не за гарамі

**Пра гэта ненадакучлівае і, як заўсёды, загадзя нагадвае сваім кліентам рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Белпошта».**




З 1 лістапада яно прадастаўляе магчымасць у любым аддзяленні паштовай сувязі, у паштальёнаў альбо на сайце прадпрыемства www.belpost.by замовіць і аплаціць «Віншаванне Дзеда Мароза». Выбар ёсць: гэта можа быць маляўнічы ліст — пасланне ад казачнага персанажа з добрымі пажаданнямі ў арыгінальным канверце, можна — той ліст і падарунак у выглядзе цікавай дзіцячай кніжкі, а то і (у дадатак) адной з цацак — сімвалаў 2015 года (а таксама рукзачок або пенальчык). Кошт арыгінальнага сюрпрызу, здольнага задаць святочны настрой, — ад 25 да 175 тысяч рублёў на тэрыторыі нашай краіны і ад 45 да 225 тысяч рублёў пры адпраўцы за мяжу.

Так што, пасля выбару на карысць нейкага з варыянтаў застанецца драбяза: на бланку заказу ўказаць прозвішча, імя, адрас і кантакты адпраўніка і атрымальніка, аплаціць паслугу. «Віншаванне Дзеда Мароза» паступіць адрасату напярэдадні навагодніх свят.

Заказы на паслугу па тэрыторыі Беларусі прымаюцца да 22 снежня, у краіны СНД і далёкага замежжа — да 1 снежня.

**Валянціна ДОЎНАР**

## Даты | Падзеі | Людзі

**14 ЛІСТАПАДА**

**1812** год — нарадзіўся (вёска Крошын, цяпер Баранавіцкі раён) Паўлюк (Павел Восіпавіч) Багрым, беларускі паэт. За рапаўсюджванне антыпрыгонніцкіх вершаў здадзены ў рэкруты (дакументальна не пацверджана). Працаваў у Крошыне кавалём. Захаваўся адзін верш «Зайграй, зайграй, хлопча малы» — шэдэўр беларускай лірыкі XIX ст. У Крошынскім касцёле да гэтага часу захоўваецца металічная люстра работы Багрыма — узор мастацкай коўкі таго часу. Памёр прыблізна ў 1891 годзе. У 1985-м у Крошыне адкрыты музей народнага мастацтва і рамёстваў імя П. Багрыма.

**1765** год — нарадзіўся Роберт Фултан, амерыканскі вынаходнік. «Караблі без ветразяў — гэта бязглуздзіца. Месца пары — на кухні, у каструлі пад вечкам…». Адмовіўшыся ад праектаў Роберта Фултана, імператар Напалеон Банапарт зрабіў фатальную памылку. Калі б ён прафінансаваў праекты амерыканскага вынаходніка, то атрымаў бы адразу дзве тэхналогіі — выраб параходаў і падводных лодак. Гэта, магчыма, дазволіла б нейтралізаваць флот Англіі і вывесці з вайны свайго галоўнага праціўніка. Падводныя лодкі асуджалі на гібель усе флаты свету і змянялі сістэму вядзення вайны на моры. Не жадаючы нічога мяняць, Англія ўслед за Напалеонам таксама адмовілася падтрымаць вынаходніка. Фултан вярнуўся ў Амерыку. А праз некалькі гадоў газеты паведамілі аб рэгулярных рэйсах фултанскіх параходаў па Гудзоне.



**1939** год — 75 гадоў таму 3-я (пазачарговая) сесія Вярхоўнага Савета Беларускай ССР прыняла Закон «Аб прыняцці Заходняй Беларусі ў склад Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі». У выніку аб'яднання Заходняй Беларусі і БССР насельніцтва рэспублікі павялічылася да 11 мільёнаў чалавек.

### Было сказана

**Кузьма ЧОРНЫ, пісьменнік, публіцыст, перакладчык:**

*«Кожная дарога куды-небудзь вядзе, але ты выбірай тую, якая не вядзе ў прорву».*

## УСМІХНЕМСЯ

Заканчваецца другі год нашага сямейнага жыцця. Муж да гэтага часу думае, што ён не есць кабачкі і цыбулю.

**— Прыгатуй мне паесці!**
**— Будзь больш рамантычным.**
**— Прыгатуй мне паесці пад дажджом.**

Птушкі, якія пряляцелі на зімоўку з Расіі ў Турцыю, п'юць, мацюкаюцца і перашкаджаюць зімаваць іншым птушкам.

**— Чаму ваша дзіця так крычыць? Таго яно хоча?**
**— Крычаць яно хоча!**

Купі зямлю, гной, торф, цяпліцу, насенне, угнаенне, сродкі ад шкоднікаў, рассаду, інструменты, машыну, бензін — і атрымлівай асалоду ад БЯСПЛАТНАЙ садавіны і гародніны з уласнай дачы!




caricatura.ru




**Гэта асобы неверагодна дапытлівыя, але ў той жа час празмерна пераборлівыя і ў сваіх інтарэсах маюць цалкам пэўны пункт гледжання. Яны часта вядуць за сабой іншых людзей, заўсёды гатовы што-небудзь палепшыць. Моцны бок народжаных у гэты дзень людзей — адсутнасць неабходнасці ў пустой пахвальбе іх дасягненняў і талентаў. Дзякуючы такой упэўненасці ў сваіх сілах яны беспамылкова адчуваюць ліслівасць і няшчырасць. Народжаныя 14 лістапада заўсёды паслядоўныя ў сваіх імкненнях у дасягненні азначанай мэты. Ім неабходна з самага пачатку быць упэўненымі ў правільнасці абранага шляху.**


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар—галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 19.953. Індэкс 63850. Зак. № 4633.

Нумар падпісаны ў 19.30 13 лістапада 2014 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12